ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 39 (4291)
Аўторак, 16 лютага 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ—За добрую дарогу (1 старонка). С. ВЕЛІЧ—ЧОРНАЯ МЭТАЛЮРГІЯ Ў ЗАКЛЮЧНЫМ ГОДЗЕ ПЯЦІГОДКІ (3 старонка). КОНСТ.—Па чужой указцы (4 стар.).

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б ад дзкадніку генэральнай праверкі барацьбы за суцэльную пісьменнасьць (1 стар.)

Пастанова XIV зьезду КП(б)Б па справаздачы ЦКК-РСІ БССР (2 стар.).

Не павінна быць ні аднаго калгасу бяз вытворча-фінансавага пляну. Па-новаму перабудаваць кіраўніцтва прамысловасьцю. Рашучы адпор дэмабілізацыйным настроям—асноўнай прычыне зацяжкі збожжазагатовак. Вывазцы торфу—ударныя тэмпы (1 стар.).

Падрыхтоўка да XIV гадавіны РСЧА (2 стар.).

Пасталінныя брыгады па пераапрацоўцы ільну забясьпечыць пасьпяховае скончэньне работы і выкананьне плянаў загатовак. Рэалізацыйны б сталінскіх умоў у дзло забясьпечваюць перамогу. Поўнасьцю аміцыцыяваць праграму рэканструкцыі камунальнай гаспадаркі (3 стар.).

КІТАЙ—Перад рашаючай схваткай за Шанхай (4 стар.).

ПОЛЬШЧА.—Польскі фашызм рыхтуецца да захвату Дэнцыга (4 ст.).

ЗА ДОБРУЮ ДАРОГУ!

Гіганцкія посьпехі індустрыялізацыі забясьпечылі выкананьне ленінскай задачы аб перасадцы **«мужыка з каня і калёс на аўтамабіль і трактар»**. Сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі мае дзесяткі тысяч трактараў і грузавых аўтамабіляў.

Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі, рост дабрабыту калгасьніка і працоўнага селяніна-адпаасобніка непарыўна зьвязаны з ростам грузаперавозак ад індустрыяльных цэнтраў у саўгасы і ў вёскі, а в другога боку — рост таварнасьці сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі дае рэзкае павялічэньне перавозак з вёскі у індустрыяльныя цэнтры.

Зусім відавочна, што як трактар і аўтамабіль, так і выкананьне плянаў грузаперавозак, а таксама наладжаньне культурнай сувязі паміж гарадам і вёскай, узмацненьне абароназдольнасьці — усё гэта патрабуе добрай дароги. Між тым, дароги ў нас яшчэ дрэнныя. Тэмпы выкананьня пляну дарожнага будаўніцтва адстаюць ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Наша партыя, якая з вялікім посьпехам, з бальшавіцкім запалам ажыцьцяўляе задачу, пастаўленую тав. Леніным, — «дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны ў тэхніка-эканамічных адносінах», — ня можа дапусьціць, каб дароги затрымлівалі тэмпы асьпітэньня сельскай гаспадаркі новай тэхнічнай базай і былі тормазам грузаперавозак.

Нельга больш дярпець вялізарных страт ад бездарожжа. З прычыны адсутнасьці здавальняючай сеткі дарог аўтатранспарты парк скарыстоўваецца далёка недастаткова і хутчэй зношваецца. Кошт перавозкі тона-кілёмэтру грузу па прасёлачнай дарозе на 100 проц. вышэй, чым па шляху. А колькі калечыцца сялянскіх коняй, памаецца калёс, рвецца збруі з прычыны дрэнай дароги?

У той час, як кожны рубель павінен ісьці на ўзмацненьне тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, у нас многа сродкаў паглынаюцца бездарожжам. На гроші, якія траціцца толькі за адзін год, можна пракласьці тысячы кілёмэтраў добрых дарог. Адсюль зусім відавочна актуальнасьць пытаньня барацьбы за добрую дарогу.

XVII усесаюзная партканфэрэнцыя ў сваёй рэзалюцыі дала зусім выразныя дырэктывы: **«Па дарожным і шасэйным будаўніцтве і аўтамабілізацыі забясьпечыць больш шпаркія тэмпы разьвіцьця, чым па іншых відах транспарту»**. Гэта абавязвае партарганізацыі разгарнуць сапраўды бальшавіцкія тэмпы на падцягненьні гэтага адсталага участку народнай гаспадаркі.

Абвешчаны ЦК КП(б)Б з 15 лютага па 15 сакавіка месячнік дапамогі дарожнаму будаўніцтву ставіць у якасьці асноўнай задачы — **«поўную вывазку патрэбнай колькасьці каменьня, пяску, гравія і лесаматэрыялу для патрэб дарбудаўніцтва і палепшэньня дарог мясцовага значэньня»**.

Пастанова патрабуе ад кожнага райкому партыі і райвыканкому, ад кожнай партыйнай і камсамольскай ячэйкі, прафсаюзнай арганізацыі, ад кожнага сельсавету, саўгасу і калгасу мабілізацыі ўсіх сіл і ўвагі на выкананьне пляну падрыхтоўкі да дарожнага будаўніцтва. Уся пралетарская грамадзянскасьць, калгасныя масы, працоўныя вёскі павінны быць прыцягнуты да пасьпяховага выкананьня праграмы загатовак і вывазкі будматэрыялаў.

Абвяшчэньне месячніка, як паказана ў пастанове ЦК, выклікаецца тым, што **«работы па дарожным будаўніцтве пачаты з вялікім спазьненьнем, у выніку чаго ёсьць прарыў у галіне загатовак і вывазкі асноўных будматэрыялаў, што стварае пагрозу зрыву дарожна-будаўнічай праграмы 1932 году»**. Гэта спазьненьне неабходна ў бліжэйшыя дні перакрыць ударным фарсаваньнем работ. Выкананьне пляну загатоўкі і вывазкі каменьня на 8 проц. гравія — на 1 проц., пяску — на 2 проц. —ганебныя ганьбы. У працягу месячніка забясьпечым круты ўздым тэмпаў выкананьня пляну.

Калгаснаму сэктару належыць перадавое месца ў барацьбе за добрую дарогу. Ад яго патрабуецца арганізаваны ўдзел у месячніку, узорнае правядзеньне работ, налажаньне абозаў вывазкі будматэрыялаў і г. д. Кожны калгаснік павінен быць перадавіком у справе выкананьня свайго абавязку па ўдзеле ў месячніку, павінен быць узорам для бедняка і серадняка—адпаасобніка. Райкалгассаюзы абавязаны правесьці адпаведную работу, каб забясьпечыць масавы ўдзел калгасьнікаў у месячніку.

Трэба прымусіць кулацка-заможныя гаспадаркі поўнасьцю выканаць цьвёрды заданьні на лініі працэнтаванасьці.

Камсамольскія арганізацыі, па прыкладзе мінулага году, павінны быць наперадзе ў барацьбе за выкананьне пляну месячніка. Ня гледзячы на тое, што месячнік ужо пачаўся, ПК ЖКСМБ таксама, як і ЦКПСБ, яшчэ нават не распрацавалі пляну ўдзелу гэтых арганізацый у месячніку.

Значную дапамогу ў правядзеньні месячніка могуць і павінны аказаць і піянэры праз вышукваньне каменьня, арганізацыю грамадзкай думкі і г. д.

Поспех месячніка залежыць у першую чаргу ад правільнай арганізацыі працы, расстаноўкі сіл, ад поўнага выкарыстаньня мэханізмаў, рабочай і гужавой сілы. Барацьба за рэалізацыю пасьці ўмоў тав. Сталіна і па гэтым вучэньню — рашаючы вагар выкананьня пляну месячніка.

Пры цэнтральным штабе па кіраўніцтве месячнікам створан фонд у суме 100 тысяч рублёў для прэміяваньня за лепшую работу па правядзеньні месячніка. Тыя раёны і сельскія арганізацыі, калгасы і калгасьнікі, камсамольскія ячэйкі і школы, раённыя газэты, якія пакажуць лепшыя ўзоры барацьбы за плян — будуць прэміяваны. Трэба ўзьняць хвалю сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва як паміж паасобнымі ўдзельнікамі работ, так і паміж арганізацыямі.

Разгортваючы масаваерастлумачэньне задач месячніка, выкрываючы кулацкую агітацыю, вядучы рашучую барацьбу з клясавым ворагам і яго агентурай унутры партыі—правымі і «левымі» апартуністамі, якія перашкаджаюць бальшавіцкім тэмпам работы, наладзіўшы апэрацыйнае кіраўніцтва ходам месячніка з боку партарганізацый,—забясьпечым выкананьне пляну дарбудаўніцтва. На барацьбу за добрую дарогу.

НЕ ПАВІННА БЫЦЬ НІВОДНАГА КАЛГАСУ БЯЗ ВЫТВОРЧА-ФІНАНСАВАГА ПЛЯНУ

Барацьба за якасьць—аснова пляну

Тэрміны складаньня вытворча-фінансавых плянаў у калгасах даўно прайшлі. Паводле пастановы Белкалгасцэнтру гэтую работу трэба было скончыць да 20 студзеня. Аднак, па 10 лютага з 9.952, плян склалі толькі 13% калгасаў. Тут значная віна падае на Калгасцэнтр, які са спазьненьнем даслаў у раёны формы пляну, не мабілізаваў увагі Райкалгассаюзаў на важнасьці пляніраваньня сацыялістычнай гаспадаркі. Допісы з месц сьведчаць аб тым, што некаторыя раёны (Мсьціслаўе, Смалявічы) нават не распачалі работы па складаньні пляну, чым тармозяць падрыхтоўку калгасаў да веснавой сяўбы.

Вытворча-фінансавы плян калгасаў важны тым, што ў ім павінна быць адлюстравана **барацьба за якасьць работы**, сельска-гаспадарчай працэсы, намечана праграма дзейнасьці па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, распрацаваны агратэхнічныя мерапрыемствы, удзіна поўнае выкарыстаньне людзкой рабочай сілы.

Усе лішкі рабочай сілы арганізаваць, у парадку адыходніцтва, трэба накіраваць для работы ў сацыялістычную прамысловасьць, у саўгасы, на торфараспрацоўкі і г. д. Адгэтуль зусім зразумела, што складаньнем вытворча-фінансавых плянаў павінны быць зайнятыя ня толькі самі калгасы, але і гаспадарчыя аб'яднаньні, фабрыкі, заводы.

Складаньне плянаў павінна праходзіць не фармальна, не габінэтным парадкам, а з удзелам шырокіх калгасных мас. Як колгасныя, так і якасныя пляновыя паказальнікі трэба абгаварваць на сходах, у брыгадах, на вытворчых нарадах. Толькі той **плян, які будзе выпрацаваны з удзелам мас, зьявіцца рэальным плянам** і ў працэсе гадавой работы будзе цалкам выкананы.

У гэтым годзе па калгасах намячаецца вялізарнае капітальнае будаўніцтва. Улічыць гэе ўнутраныя рэсурсы, пры будаўніцтве выкарыстаць аграмаджаныя будматэрыялы, правільна скарыстаць атрыманыя крэдыты, улічыць кожны рубель, даходы і расходы — адна з важнейшых задач пры складаньні вытворча-фінансавых плянаў.

У некаторых калгасах не хапае рахункаводаў, якія маглі-б прарабіць усю працу па ўліку ў сувязі са складаньнем плянаў. Але-ж гэта ня прычына для тлумачэньня марудных тэмпаў. Лют ЦП пасьці прафсаюзаў, які сёньня зьмяняецца, сьведчыць, што прафсаюзы, прадпрыемствы, савецкія ўстановы ідуць на дапамогу калгасам, мабілізуюць рахункаводаў. Справа заключаецца ў тым, каб партыйныя арганізацыі мабілізавалі грамадзкасьць, правільна выкарыстаў пазтных рахункаводаў пры складаньні вытворча-фінансавых плянаў.

Больш марудзіць нельга. Трэба зразумець, што вытворча-фінансавы плян гэта **ня тэхнічная справа**, а вялізарная **арганізацыйная** работа па ўмацаваньні калгаснай вытворчасьці. Раённыя арганізацыі павінны дабіцца складаньня пляну за ўсіх калгасах у самы бліжэйшы час.

Гастралююць з аднаго калгасу ў другі

СМАЛЯВІЧЫ. (Наш спэцкар.). — 20 студзеня трэба было скончыць складаньне вытворча-фінансавых плянаў у калгасах. Але ў Смалявіцкім раёне яшчэ і зараз пра выкананьне гэтага пункту пастановы нічога ня чутно.

Калгасы ня маюць каштоўных лічбаў слубы на 1932 год. У выніку яны ня могуць распачаць складаньня вытворча-фінансавых плянаў. Ня ведаючы плошчы пасеву яравога кліну, нельга ўлічыць колькі патрэбна рабочай сілы, насеньня, штучнага ўгнаеньня і г. д.

Брыгаду Цэнтральнага Дому Калгасьніка БССР, якая прыехала ў Смалявіцкі раён, каб дапамагчы калгасам складаць пляны, зямельныя органы і МТС не скарысталі. МТС па працягу 4-х дзён не давала брыгадзе пасеўных лімітаў, без якіх немагчыма было распачаць працу.

Кадраў у калгасах, якія-б ведалі тэхніку складаньня гадавых вытворча-фінансавых плянаў, зусім няначная колькасьць. Аграномы-ж райкалгассаюзу і МТС, замест таго, каб дапамагаць калгасам у складаньні пляну, — гастралююць з аднаго калгасу ў другі, нічога ня робячы. Яны зусім не прынялі ўдзелу ў складаньні прыкладнага пляну брыгадай ЦДК, якой без указаньняў агранома працаваць было вельмі цяжка. Складзены брыгадай плян не скарыстаны.

Вытворча-фінансавы плян — гэта баявая праграма дзейнасьці па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, па ўзьнаўленьні ўрадлівасьці.

Адсутнасьць усялякай работы па складаньні вытворчых плянаў сьведчыць аб тым, што ў Смалявіцкім раёне яшчэ да гэтага часу ігнаруюць цэнтральную задачу калгаснага будаўніцтва.

Аказаць практычную дапамогу

Да ўсіх шэфскіх арганізацый і рахункавых работнікаў

Адным з важнейшых момантаў падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, ажыцьцяўленьня пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага «Аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў» зьяўляецца складаньне вытворча-фінансавых плянаў, палепшэньне справы ўліку ў калгасах.

Пастанова ЦК абавязвае прафсаюзы рашуча павярнуцца да калгаснага будаўніцтва, праз шэфтаварыствы дапамагчы раёнам умацоўваць калгасы ў іх сучаснай арцельнай стадыі разьвіцьця, перадаць лепшы вопыт сацспаборніцтва і ўдарніцтва вытворчым калгасным брыгадам.

Адсутнасьць выстарчальнай колькасьці рахункавых работнікаў перашкаджае своячасоваму складаньню вытворча-фінансавых плянаў у калгасах на 1932 год. Задача прадпрыемстваў, савецкіх арганізацый, якія шэфствуюць над вёскай,—дапамагчы калгасам у складаньні вытворча-фінансавых плянаў, наладзіць рахункаводства, справаздачнасьць, прыняць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы рахункаводаў для калгассыстэмы.

Асабліва вялікую ролю ў гэтым напрамку могуць адыграць тыя савецкія арганізацыі і ўстановы, якія маюць на вёсцы шырокую сетку кваліфікаваных рахункавых работнікаў (канторы Дзяржбанку, саўгастрэсты і інш.).

Рахункова-бухгальтарскія работнікі савецкіх, гаспадарчых і грамадзкіх устаноў раённых і вясковых зьвеньняў, а таксама настаўніцтва і іншыя культурныя сілы вёскі павінны ўстанавіць пад адпаведнымі калгасамі пастаянае шэфства, рэгулярна ім дапамагаць у наладжаньні ўліку.

ЦП саюзу фінансава-банкаўскіх работнікаў, дзяржустаноў, працасьветы, МТС, жывёлагадоўных і насеннаводчых саўгасаў ужо **далі канкрэтныя паказаньні** на месцы і зварачаюцца да ўсіх рабочых шэфаў, да ўсіх рахункавых работнікаў зараз-жа заказаць практычную дапамогу калгасам па складаньні вытворча-фінансавых плянаў, наладжаньні справы ўліку.

Разгортваючы сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж фабрыкамі, заводамі, установамі, ігласобнымі рахункавымі работнікамі неабходна ў кожным калгасе арганізаваць паказальную пастаноўку ўліку, зараз-жа дапамагчы склаўці гадавы вытворча-фінансавы плян.

Наш баявы лёзунг—**«У 1932 годзе ніводнага калгасу бяз вытворча-фінансавага пляну, бяз правільнай пастаноўкі ўліку і справаздачнасьці».**

ЦП саюзу фінбанкаўскіх работнікаў: КАЙКОЎ.
ЦП саюзу дзяржустаноў БАШМАЧНІКАЎ.
ЦП саюзу працасьветы ДВАРЭЦКІ.
ЦП саюзу МТС і батрацтва РАЖКОЎСКІ.
ЦП саюзу жывёлагадоўчых саўгасаў КАРПУСЕНКА.
ЦП саюзу насеннаводчых саўгасаў ЛАШКО.

Да складаньня пляну не прыступілі

МСЬЦІСЛАЎЕ. (Наш кар. Свалчасовае складаньне вытворча - фінансавых плянаў у калгасах мае актуальнейшае значэньне. Гэтага ня ўлічылі ў Мсьціслаўі, дзе на сёньнішні дзень фактычна не разгорнута работа па складаньні пляну. Бюро райкому КП(б)Б вынесла пастанову аб скончэньні складаньня іх да 5 лютага. Гэта дырэктыва райкалгассаюзам і МТС ня выканана.

Толькі 7-8 лютага разасланы бляны пляну, якія, папаўшы ў калгас, ляжаць бяз руху. Складаньне вытворча - фінансавых плянаў патрабуе кваліфікаванай сілы, якой у калгасах не хапае, але-ж раённыя арганізацыі не мабілізавалі актыву на гэту адказную работу.

Мсьціслаўшчына павінна зараз-жа прыступіць да выкананьня дырэктыў, ураду па складаньні вытворча - фінансавых плянаў у калгасах, мабілізаваўшы на гэту справу неабходную колькасьць кваліфікаваных работнікаў раёну.

А.

Па-новаму перабудаваць кіраўніцтва прамысловасьцю

„Лічыць неабходным... забесьпячэньне канкрэтнага кіраўніцтва, даведзенага да прадпрыемства і агрэгату, дакладную праверку і забесьпячэньне выкананьня данага заданьня"(з рэзалюцыі XVII партканфэрэнцыі на дакладу тав. Арджанікідзэ)

Баявая задача гаспадарчых арганізацый

XVII Усесаюзная партканфэрэнцыя ў рэзалюцыі па дакладу т. Арджанікідзэ адзначыла, што адным з галоўных недахопаў у рабоце прамысловасьці ў 1931 г. зьяўлялася адсутнасьць гаспадарчых арганізацый ад прадпрыемстваў і невыстарчальнае кіраўніцтва імі. Важнейшай умовай пасьпяховага ажыцьцяўленьня пляну 1932 г. зьяўляецца забесьпячэньне канкрэтнага кіраўніцтва, даведзеньне апошняга да прадпрыемства і цэху, дакладная праверка выкананьня даных заданьняў. Канфэрэнцыя падкрэсьліла, што тубкал, жывая сувязь з заводамі і цэхамі і праверка выкананьня павінны стаць галоўнымі задачамі ўсіх гаспадарчых арганізацый.

Дрэнна працуе той гаспадарнік, які абмяжоўваецца агульнымі распараджэньнямі і голымі дырэктывамі. Нічога ня варты той кіраўнік прадпрыемствам, які ня можа наладзіць праверкі выкананьня. Праверка ні ў якім разе не павінна зводзіцца да фармальна-бюракратычнага адміністраваньня, а павінна дапамагчы заводу выпраўляць памылкі, паляпшаць іх.

У сьвятле дырэктыў XVII партканфэрэнцыі вялікае значэньне набываюць факты, прыведзеныя ў карэспандэнцыях з Гомеля і Віцебску, якія сёньня друкуюцца ў «Зьвязьдзе».

Белкураб'яднаньне і Белмэталяб'яднаньне дагэтуль ціпчэ не перабудавалі сваёй работы па-новаму, не наладзілі жывой апэрацыйнай сувязі, кіраўніцтва і дапамогі прадпрыемствам. Белкураб'яднаньне зусім не інструктуе падпарадкаваных яму заводаў, не адказвае на запытаньні прадпрыемстваў, часта тармозіць правядзеньне важных мерапрыемстваў (ліквідацыя ўраўнілаўкі ў апараце адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу заводу «Чырвоны мэталіст»). Белкураб'яднаньне, замест сапраўднай садзейнасьці ў забесьпячэньні заводаў сырцом, абмяжоўваецца пасылкай тэлеграм з голымі абяцаньнямі.

Так далей працаваць нельга. Задачы ажыцьцяўленьня вялікай праграмы 1932 г. і выкананьня пяцігодкі за чатыры гады патрабуюць неадкладнай і рашучай перабудовы работы гаспадарчых аб'яднаньняў на аснове наладжаньня канкрэтнага, апэрацыйнага кіраўніцтва прадпрыемствамі і штодзённай дапамогі ім у выраўнаньні тых адказных заданьняў, якія пастаўлены перад імі.

Наладзіць плянавае кіраўніцтва прадпрыемствамі

Гомельская абутковая фабрыка «Праца» дабілася поўных дасягненьняў у рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна.

Шляхам устанаўленьня пастаянных зьмен і прымацаваньня мэтаных да рабочых на фабрыцы індывідуала абязьлічка і ўстаноўлена адказнасьць за работу. Усе цэхі пераведзены на гаспадарчы разрахунак. 21 гаспадарча-разрахунковая брыгада, якія арганізаваны на фабрыцы, паказваюць прыклады ўдарнай работы. Так, брыгада **Міхалеўская**, якая да пераходу на гаспадарчы разрахунак ня выконвала сваёй праграмы, зараз ня толькі перавыконвае заданьні, але, дзякуючы ўзорнай рабоце, штомесячна дае каля трох тысяч дэцыметраў эканоміі ў раскроі верхняй скуры.

Для ліквідацыі ўраўнілаўкі ў зарплаце на фабрыцы былі перагледжаны нормы і расцэнкі і выплочаны вядучыя прафэсіі. 800 рабочых ахоплены сацспаборніцтвам і ўзорна змагаюцца за прамфінпляны, за якасьць прадукцыі. Але гэтыя посьпехі невыстарчальныя. Аб тым, што на фабрыцы далёка ня ўсё зроблена ў галіне перабудовы работы, сьведчыць той факт, што прамфінпляны за 1931 г. выкананы толькі на 80,1 проц.

Побат з недахопамі на самой вытворчасьці значная частка віны за невыкананьне пляну 1931 г. ляжае на Белскураб'яднаньне, якое закідвала фабрыку шматлікімі тэлеграмамі з абяцаньнем забясьпечыць выкананьне праграмы сырцом, але далей тэлеграм ня пішло. Фактычна-ж фабрыка за год мела 15.434 чалавека-дні прастою і 227.340 руб. выплаты за іх.

Для забесьпячэньня фабрыкі сырцом Белскураб'яднаньне правяло такое «мерапрыемства», як перадачу апрацоўкі сыру, [illegible]ўскай гарбарні, якая не падрыхтавана для адпаведнага вырабу падошвы, поўнаму [illegible] верхняга тавару. У выніку гэтага добраякасны сырэц псуецца, і выраблену падашву часта пельга скарыстаць нават на дзіцячыя боцікі, не гаворачы ўжо аб спэцабутку. Ня гледзячы на гэта, старшыня Белскураб'яднаньня прапануе фабрыцы выпускаць маглілеўскай гарбарняй падашву ўжываць для пашыцця спэцабутку; у той жа час камісія таго-ж самага аб'яднаньня катэгарычна забараняе гэта рабіць, добра ведаючы, што боты пойдуць у брак.

1932 год фабрыка суотрэла прастоямі з-за недахопу сырцу і поўным ня выкананьнем пляну снабжэньня апошнім.

Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што Белскураб'яднаньне яшчэ не навучылася плянава кіраваць сваімі прадпрыемствамі.

В. Я.

Без інструктажу і канкрэтнай дапамогі

Выраб сельска - гаспадарчых машын, асабліва ў сувязі з надыходзячай пасеўнай кампаніяй, набывае выключнае значэньне. Між тым Белмэталяб'яднаньне ня прымае рашучых мер для таго, каб забясьпечыць іх своячасовы выпуск.

Ня гледзячы на тое, што завод «Чырвоны мэталіст» дагэтуль яшчэ не прыступіў да вырабу запасных частак і плугоў Эбрэгарда, мэталяб'яднаньне не дабіваецца, каб Ленінградскі завод адгрузіў «Чырвонаму мэталісту» патрэбнае для гэтага сталёвае лісьцё.

Дагэтуль кіраўніцтва заводамі не перабудавана ў адпаведнасьці з указаньнямі тав. Сталіна. Ужо больш за паўгода ніхто з Мэталяб'яднаньня ня бывае на заводзе «Чырвоны мэталіст». Поўнасьцю адсутнічае інструктаж. Больш таго, ураўнілаўка, якая існуе ў зарплаце адміністрацыйна - тэхнічнага персаналу заводу «Чырвоны мэталіст» з «благаславеньня» аб'яднаньня, не ліквідуецца. Так, больш двух год загадчыкі цэхаў атрымліваюць па 226 руб. у месяц, ня гледзячы на тое, што ў лічэйным цэху працуе 300 рабочых, у сялярным —150, дрэваапрацоўчым — 23 і малярным — 10. У той час, як рабочы VI разраду атрымлівае ў сярэднім 250 руб., тэхнікі-канструктары 7-га і 8-га разрадаў — 175 руб.

Заводзкія арганізацыі выпрацавалі канкрэтныя мерапрыемствы па ліквідацыі ўраўнілаўкі ў зарплаце адміністрацыйна - тэхнічнага персаналу, якія забясьпечваюць павышэньне заработнай платы без перавышэньня ўстаноўленага фонду. На працягу 4 месяцаў, ня гледзячы на неадпаразовыя напамінамі, аб'яднаньне зусім не рэагавала на гэтыя мерапрыемствы, толькі 23 студзеня быў атрыманы адказ, у якім заводзкім арганізацыям катэгарычна забаронена рэгулёўваць зарплату адміністрацыйна - тэхнічнага персаналу. Дырэктару па працы тав. **Жытальзэйеру** за катэгарычнае патрабаваньне зацьвярджаньня выпрацаваных мерапрыемстваў вынесена папярэджаньне. Усё гэта гаворыць аб тым, што Белмэталяб'яднаньне працуе яшчэ па-старому.

Арк. Зарубежны.

ВЫВАЗЦЫ ТОРФУ—УДАРНЫЯ ТЭМПЫ ЗВОДКА

вывазкі торфу за першую пяцідзеўку лютага 1932 году

Зывезена Белторфам	Проц. выкан. пяцідзеўк. пляну	Процант выкан. кварт. пляну на 5 лютага
Торфазавод імя Даўмана	71,3	44,5
„ „Чырвоны сьцяг"	46,3	20,4
„ „Закраш. Мох"	25,2	28,1
„ „Бальшавік"	10,9	5,8
„ „Міханавічы"	0	80,0
„ „Пралетары"	0	53,5
РАЗАМ:	18,2	26,0
Вывезена спажыўцамі:		
Папяровая ф-ка „Спартак" (Шклоў)	100	40
Цэмзавод (Крычаў)	95	59,2
Ф-ка штучнага шоўку (Магілеў)	33,8	25,7
Шклозавод (Касьцюкоўка)	33,1	35,8
Папяровая ф-ка „Чырвоная зорка" (Чашнікі)	12,6	7.2
Папяровая фабрыка „Герой працы" (Добруш)	4,1	18,3
РАЗАМ:	27,9	22,5
УСЯГО ПА БССР:	**25,6**	**22,3**

Вывазка торфу з балот БССР усё яшчэ праходзіць надзвычай марудным тэмпамі. На 5 лютага Белторфам вывезена 26 проц. квартальнага заданьня, спажыўцамі—22,5 проц. Першая пяцідзеўка лютага ў параўнаньні з апошняй пяцідзеўкай студзеня, замест павышэньня, дала зьніжэньне тэмпаў. Так, калі за апошнюю пяцідзеўку студзеня па БССР было вывезена 10.847 тон торфу, дык за першую пяцідзеўку лютага —толькі 7.386 тон.

Ні адзін з торфазаводаў (акрамя «Чырвонага тарфяніка») і прадпрыемстваў за першую пяцідзеўку лютага ня выканаў сваіх заданьняў, а торфазаводы «Міханавічы», «Пралетары». Асінторф і прадпрыемствы: шклозавод імя Домбаля, запалкавая фабрыка «Чырвоная Бярэзіна», «Возьвей», Гомсельмаш, «Чырвоны хэмік» нават ня вывезьлі ні аднэй тоны.

Торфазавод «Бальшавік» і папяровая фабрыка «Герой працы» па-ранейшаму плятуцца ў хвасьце вывазкі торфу.

Асноўнай прычынай такіх марудных тэмпаў зьяўляецца ўсё яшчэ невыстарчальнае забесьпячэньне вывазкі неабходнай колькасьцю возчыкаў. Больш шасьць торфазаводаў і прадпрыемстваў не разгрэбуцца, як сьлед, масавай работы вакол кампаніі па заключэньні дагавораў з калгасамі і аднаасобнікамі—беднякамі і серадняками.

Выканалі плянавае заданьне

КНЯЖЫЦЫ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

ПЛЯНАВАЕ ЗАДАНЬНЕ ПА ВЫВАЗЦЫ ТОРФУ Ў КОЛЬКАСЬЦІ 9 ТЫСЯЧ ТОН ВЫКАНАНА. ПРАЦЯГВАЕМ ВЫВАЗКУ АСТАЧЫ ТОРФУ ЗВЫШ ПЛЯНУ.

ДЫРЭКТАР ТОРФЗАВОДУ «ЧЫРВОНЫ ТАРФЯНІК»—РУДНІКАЎ.

Вынік ударнай работы

У ВЫНІКУ ШЫРОКА РАЗГОРНУТАЙ МАСАВАЙ РАБОТЫ СЯРОД КАЛГАСНЫХ І БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ МАСАВАКОЛ СВАЯЧАСОВАГА І ВЫСОКАЯКАСНАГА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ АПАЛАМ, РАДУЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ, ЖЛОВІНСКАГА РАЁНУ, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ МЯСЦОВАЙ ПАРТЫЙНАЙ ЯЧЭЙКІ, ДАБІЎСЯ ПОЎНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ ПА ВЫВАЗЦЫ ТОРФУ. ВЫВЕЗЕНА 1.000 ТОН, АБО 100 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ. СЛЕДУЮЧЫ ЯГО ПРЫКЛАДУ, ПЯРЭВІЦКІ І КАЗІМІРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТЫ ТАКСАМА НАБЛІЖАЮЦЦА ДА ПОЎНАГА ВЫКАНАНЬНЯ СВАІХ ЗАДАНЬНЯЎ.

ШАДУРО.

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа -прыватніку" (ЦК УсеКП(б)

РАШУЧЫ АДПОР ДЭМАБІЛІЗАЦЫЙНЫМ НАСТРОЯМ

--АСНОЎНАЙ ПРЫЧЫНЕ ЗАЦЯЖКІ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАКІ

16-га лютага

Апошнія 10,9 проц. выканаць у бліжэйшыя дні

СЛУЦАК.

Слуцкаму раёну засталося выканаць яшчэ 10,9 проц. гадавога пляну збожжазагатовак. Аднак, іменна гэтыя «апошнія процанты» выконваюцца вельмі марудна. Гэта вынік яўнага дэмабілізацыйных настрояў, якія маюць месца ў паасобных раённых арганізацыях і сельсаветах. Замест таго, каб змагацца па-ўдарнаму за пасьпяховае завяршэньне збожжавай кампаніі, раённыя арганізацыі супакоіліся на дасягнутым процанце (89,1 проц.) і за апошні час амаль зусім спынілі загатоўкі.

Недапушчальна аслабіла барацьбу за збожжа і раённая газэта «Ленінскі шлях». У апошніх нумарох газэты ня зьмешчана ні аднэй заметкі аб збожжазагатоўках. Праводзячы рэйд-праверку падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, «Ленінскі шлях» ня ўвязвае гэтай работы з задачай завяршэньня збожжазагатовак.

С. П.

На 10-га лютага гадавы плян збожжазагатовак па БССР выканан на 89 процантаў. Такім чынам для завяршэньня збожжазагатоўчай кампаніі засталося выканаць яшчэ 11 проц. гадавога пляну. Дзе-ні-дзе існуе думка, што справа гэта зусім лёгкая і не патрабуе асаблівага напружаньня сіл.

Настрой аб тым, што кампанію можна завяршыць самацёкам зьяўляюцца наскрозь мартупістычнымі і павінны сустрэць руйнуючы адпор з боку ўсіх партарганізацый.

Практыка апошніх 2-3 пяцідзёвак паказала, што іменна заспакаеньне, дэмабілізацыйныя настроі прывялі да значнага аслабленьня тэмпаў работы ў некаторых раёнах, а месцамі і да поўнага спыненьня збожжазагатовак. Толькі гэтым тлумачыцца тое, што прырост у выкананьні агульна-рэспубліканскага збожжазагатоўчага пляну за першую дэкаду лютага складае ўсяго... 0,7 проц.

Трэба з коранем вытруціць усякія дэмабілізацыйныя настроі, дзе і ў чым яны-б не праяўляліся. Барацьба з дэмабілізацыйнымі настроямі павінна быць тым больш жорсткай таму, што пераважная частка раёнаў БССР дагэтуль яшчэ не завяршыла збожжазагатовак, што рад раёнаў (Старадарожскі, Пятрыкоўскі, Кімарыцкі, Брагінскі і інш.) ня выканалі нават і 70 проц. заданьня, а плян загатовак асноўных харчовых культур (жыта і пшаніцы) у цэлым па рэспубліцы рэалізаван усяго на 61,7 процантаў.

Да 1 сакавіка збожжазагатоўкі па БССР павінны быць поўнасьцю і пасьпяхова выкананы. Гэта значыць, што плян загатовак павінен быць выканан кожным раёнам, кожным сельсаветам, калгасам і саўгасам. Гэта значыць, што плян павінен быць выканан ня толькі ў цэлым, але і **па кожнай пасаобнай культуры** і ў першую чаргу **па жыце і пшаніцы**.

Гэтыя баявыя задачы абавязваюць усе партарганізацыі да яшчэ большага разгортваньня работы вакол збожжазагатовак, да мабілізацыі шырокіх мас калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў, да рашучага адпору ўсякім дэмабілізацыйным настроям, да безьлітаснай барацьбы з кулацтвам і яго агентурай — правымі і «левымі» апартуністамі.

1-га сакавіка канчаецца ўсебеларускі конкурс на лепшае завяршэньне збожжазагатовак. Кожны раён павінен паставіць сабе задачай—пасьпяховым скончэньнем збожжазагатовак, выкананьнем пляну па ўсіх паказальніках заваяваць першае месца ва ўсебеларускім конкурсе.

За дэкаду толькі 1,5 проц. прыросту

ШКЛОЎ (Наш кар.).

Тэмпы збожжазагатовак па Шклоўскім раёне рэзка зьнізіліся. На 10 лютага гадавы плян выканан усяго на 86,7 проц. Прырост за дэкаду лютага складае толькі 1,5 проц.

Гэта результат дэмабілізацыйных настрояў, якія маюць месца у радзе сельсаветаў і з боку паасобных кіруючых работнікаў раённых арганізацый.

У прыкладнасьці, зусім зрываецца выкананьне цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі. У выніку невыстарчальнага націску па кулака, цьвёрдыя заданьні па раёне на 5 лютага спалічаны толькі на 55,7 проц.

Я. Новікаў.

Дэкаднік генэральнай праверкі барацьбы за суцэльную пісьменнасьць

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

1. Згадзіцца з прапанов

Пастанова XIV зьезду КП(б)Б па справаздачы ЦКК-РСІ БССР

Заслухаўшы справаздачы дакладчыка, Калініна аб рабоце ЦКК КП(б)Б з XIII зьезду КП(б)Б, XIV зьезд КП(б)Б прызнае палітычную лінію ЦКК правільнай і праведзеную работу здавальняючай.

I

XIV зьезд КП(б)Б са здавальненьнем адзначае, што ЦКК з усёй бальшавіцкай настойлівасьцю і радучасьцю змагаўся за паўнотнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, аховываючы жалезнае адзінства КП(б)Б у бязьлітасным барацьбе з правым апартуністам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, нанесшы рашучы ўдар па яго кляўзных посьбітах як у тэорыі, так і на практыцы. ЦКК у той жа час правяла вялікую работу па выкрыцьці і барацьбе з контр-рэвалюцыйным белагуардзкім нацыянал-дэмакратызмам, па ачыстцы КП(б)Б ад агентуры нацыянал-дэмакратызму у радах партыі, выкрыцьцю іх буржуазна-нацыяналістычны зарадніцкі твар перад партыйнымі і рабочымі масамі. ЦКК таксама разгула змагалася з правымі ўхілам, мірнымі, сялянскім і іншым лібералізмам, прымірэнцтвам, выганяючы з радоў партыі двурушнікаў, іхіх фармальна галасуючы за лінію партыі, а на справе яе не праводзьць, ачышчаючы партыю ад тых «камуністаў», якія па-чынаўнічку, бюракратычна-бядуцтва адносяцца да справы сацыялістычнага будаўніцтва, да патрэб рабочай класы і шырокіх мас працоўных.

XIV зьезд КП(б)Б ухваляе праведзеную работу ЦКК па барацьбе за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі. Канцэнтруючы асноўны агень на вялікадзяржаўным шавінізме, як галоўнай небясьпецы на даным этапе, нанесючы рашучы ўдар па яго кляўзных посьбітах як у тэорыі, так і на практыцы, ЦКК у той жа час правяла вялікую работу па выкрыцьці і барацьбе з контр-рэвалюцыйным белагуардзкім нацыянал-дэмакратызмам, па ачыстцы КП(б)Б ад агентуры нацыянал-дэмакратызму у радах партыі, выкрыцьцю іх буржуазна-нацыяналістычны зарадніцкі твар перад партыйнымі і рабочымі масамі. ЦКК таксама разгула змагалася з правымі ўхілам, мірнымі, сялянскім і іншым лібералізмам, прымірэнцтвам, выганяючы з радоў партыі двурушнікаў, іхіх фармальна галасуючы за лінію партыі, а на справе яе не праводзьць, ачышчаючы партыю ад тых «камуністаў», якія па-чынаўнічку, бюракратычна-бядуцтва адносяцца да справы сацыялістычнага будаўніцтва (Лельчыцы і інш.).

ЦКК адзначала расы партый ад рэшткаў трацкісцкіх контр-рэвалюцыянераў (Каптаровіч, Пагосткін і інш.), змагаючыся з трацкісцкай контрабандай і сялім лібералізмам, прымірэнцтвам, выганяючы з радоў партыі двурушнікаў, іхіх фармальна галасуючы за лінію партыі, а на справе яе не праводзьць, ачышчаючы партыю ад тых «камуністаў», якія па-чынаўнічку, бюракратычна-бядуцтва адносяцца да справы сацыялістычнага будаўніцтва (Лельчыцы і інш.).

ЦКК адзначала расы партый ад рэшткаў трацкісцкіх контр-рэвалюцыянераў (Каптаровіч, Пагосткін і інш.), змагаючыся з трацкісцкай контрабандай і сялім лібералізмам, прымірэнцтвам, выганяючы з радоў партыі двурушнікаў, іхіх фармальна галасуючы за лінію партыі, а на справе яе не праводзьць, ачышчаючы партыю ад тых «камуністаў», якія па-чынаўнічку, бюракратычна-бядуцтва адносяцца да справы сацыялістычнага будаўніцтва, да патрэб рабочай класы і шырокіх мас працоўных.

XIV зьезд КП(б)Б ухваляе праведзеную работу ЦКК па барацьбе за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі. Канцэнтруючы асноўны агень на вялікадзяржаўным шавінізме, як галоўнай небясьпецы на даным этапе, нанесючы рашучы ўдар па яго кляўзных посьбітах як у тэорыі, так і на практыцы. ЦКК у той жа час правяла вялікую работу па выкрыцьці і барацьбе з контр-рэвалюцыйным белагуардзкім нацыянал-дэмакратызмам, па ачыстцы КП(б)Б ад агентуры нацыянал-дэмакратызму у радах партыі, выкрыцьцю іх буржуазна-нацыяналістычны зарадніцкі твар перад партыйнымі і рабочымі масамі. ЦКК таксама разгула змагалася з правымі ўхілам, мірнымі, сялянскім і іншым лібералізмам, прымірэнцтвам, выганяючы з радоў партыі двурушнікаў, іхіх фармальна галасуючы за лінію партыі, а на справе яе не праводзьць, ачышчаючы партыю ад тых «камуністаў», якія па-чынаўнічку, бюракратычна-бядуцтва адносяцца да справы сацыялістычнага будаўніцтва (Лельчыцы і інш.).

ЦКК адзначала расы партый ад рэшткаў трацкісцкіх контр-рэвалюцыянераў (Каптаровіч, Пагосткін і інш.), змагаючыся з трацкісцкай контрабандай і сялім

Рэйд брыгады „Зьвязды“ і „Бальшавіцкага сьнаргу“

Рэалізацыяй 6-ці сталінскіх умоў у дэпо забясьпечваюць перамогу

На глетзачы на посьпехі ў рабоце мытчанскага транспарту, ён усё яшчэ застаецца «вузкім месцам» у народнай гаспадарцы. Асноўная прычына невыкананьня раду вымаральнікаў за ліквідацыя ў маруднай перабудове работы па-новаму, рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна.

Дэпо—важнейшы вучастак у сыстэме мытчанскага транспарту. Праз ажыцьцяўленьне 6 сталінскіх умоў у дэпо будзе забясьпечана хуткае аздараўленьне паравознай гаспадаркі—асноўнага зьвяна транспарту.

Брыгада «Зьвязды» і рабочай мытчанскай газэты «Бальшавіцкі сьнаргу» правяла рэйд праверкі, як Арташанскае дэпо змагаецца за 6 умоў т. Сталіна.

Асноўны кадр рабочых замацаваны

У справе замацаваньня рабочай сілы і барацьбы з цякучасьцю вынікі ўся наступны малюнак. Асноўны кадр рабочых—машыністы, -іх памочнікі, сьлесары, кацельнічкі і мантэры—замацаваны на вытворчасьці. Была значная цякучасьць малакваліфікаваных сьлесараў, чорнарабочых і асабліва качагараў. За студзень выбыла 140 рабочых гэтых кваліфікацый, прыбыла 109 і за 9 дзён лютага прыбыла 24 чалавекі. Гэта цякучасьць тлумачыцца тым, што паводле транспартнага пляну на першы квартал 1932 г. вырацкі дарогі была адна меншае заклапанасьць, чым у сьнежні. І таму дэпо скарацілі штаты. А праз 2-3 дні плян быў зьмешан, і дэпо прыпушчана было зноў пачаць набор рабочай сілы.

Мэханізацыя павысіла вытворчы эфэкт

Значная работа праведзена па мэханізацыі працэсаў працы. Электрыфікаван паравозны круг, што дало вялікі эфэкт у сэнсе паскарэньня і аблягчэньня ручной работы. Раней пры ручной рабоце паварот паравоза цягнуўся 15-20 мінут пры 4-6 рабочых, а зараз 2 мінуты пры адным рабочым.

Уведзена электразварка. Гэта дало паскарэньне працэсу рамонту дэталей на 100 проц. і значнае павышэньне якасьці. Устаноўлены другі бліжэйшы варыянт больш упаскаранага тыпу для абточкі паравозных скатаў усіх серый, выпрабавальны варыянт для выпраўленьня цыляндраў, спіральны стол для тормазу Вэсьтынгаўза і г. д. Устаноўленая механічная электрыфікаваная піла на дроў дае 75 проц. паскарэньня працэсу работы пры памяншэньні рабочай сілы на 50 проц.

Аўраўнілаўка яшчэ не ліквідавана

Побач з вялікім зрухам, які ёсьць у справе ліквідацыі аўраўнілаўкі, у разе выпадкаў яна захавалася. Асноўная прычына гэтага—у невыстарчальнай арганізацыі працы. Дрэнна праведзена расстаноўка кваліфікаваных рабочых сілы. Ёсьць выпадкі, калі работы чацьвертага разраду даюцца сьлесарам 6-га разраду і падзаработ. Улік зьвяльнічыны не наладжан па першкапалковых дакумантах—нарадах якія загадзя не выдаюцца.

Адстаюць у зарыдане сьлесары абточкі, прамыўкі і міжцэхавога рамонту. У параўнаньні з заработкам рабочых дапаможных цэхаў, тут асабліва ярка выяўляецца аўраўнілаўка. У лістападзе сьлесар абточкі ў сярэднім атрымаў 100 руб., сьлесар прамывачнага рамонту—145 руб., міжцэхавога—134 руб., кансэрвацыі—110 р. і капельнічык—158 руб., у той час, як рабочыя дапаможных ц. у атрымалі значна больш: цесьляр-столяр—213 руб., маляр—422 руб., прамывальнічык—171 руб., прабівальнічык труб—144 руб. Такое-ж становішча і ў сьнежні месяцы. Праўда, ёсьць пэвны зрух у параўнаньні з лістападам у тым сэнсе, што рабочыя вядучых цэхаў атрымалі больш, чым у лістападзе, аднак, у параўнаньні з заработкам рабочых дапаможных цэхаў атрымала значна менш.

Прычына гэтага ў тым, што аксутнічае адзіная норма, адзіная намэнклятура рамонту па дарозе. У Ворпы, напрыклад, сьлесар абточкі атрымлівае 100 руб., а ў Віцебску—220-230 руб. і г. д.

Трэба таксама адзначыць, як на непармальнае зьяўішча, што качагары таварных і пасажырскіх паравозаў атрымліваюць адноўкавую пэнсію, між тым, умовы працы розныя. У выніку гэтага наглядаецца рост зрываў спаранай па пасажырскіх паравозах, бо качагары шукаюць працавацьлепш на таварных паравозах, дзе праца значна лягчэйшая.

У дэпо аксутнічаюць графікі работ па рамонце паравозаў. Няма іх і ў дапаможных цэхах.

Жыве і абязьлічка

Абязьлічка на паравозах яшчэ ня зьвяшчана. Паводле афіцыяльных вестак у студзені было 6,6 проц. зрываў спаралай. За 5 дзён лютага—10.2 проц. Зрывы ў большай частцы бываюць па прычыне няўкі качагараў. Не зьявіліся качагары: **Мараеў, Гурэцкі, Пушкін, Васілеўскі, Рагоўскі, Масаловіч і Картавенка.** Качагар **Дубавец** зьявіўся 9 лютага на работу п'яным і ня быў дапушчан да яе. Паглядаецца ацаблеьнае процідзеяньні і сярод саміх парадчыкаў. Парадчык **Гардзіенка** зьявіўся на дзежурства 8 лютага таксама п'яным.

У дэпо праведзена прымацаваньне рабочых да ўсіх варыятатаў. Прымацаваньне таксама праведзена і па ўсіх паравозах, апрача 3 пасажырскіх №№ 96-16, 96-35 і 98-74. Гэтыя паравозы працуюць на поўныя месяцы і ня маюць гаспадароў.

Парт'ячэйкі і цэхкомы паравозьнікаў не правяраюць рацыучай барацьбы са зрывамі спаравай, не наладзілі работы вытворча-таварыскага суда. Зрыўчыкі не нясуць заслужанага пакараньня.

Матар'яльна-бытавое абслугоўваньне

У галіне рабочага забясьпячэньня і бытавога абслугоўваньня рабочых хопіць і ёсьць значнае палепшэньне, аднак, рад дэфэктаў яшчэ ня зжыт. Сталовая дэпо працуе добра, зьяўляецца адной з лепшых на вузьле, але санітарнае становішча яе дрэннае. На рабоце сталовай адбіваецца аксутнасьць дапаможных памяшканьняў. Фабрыка-кухня, якая павінна была быць скончана будаўніцтвам і сьнежні месяць, не распачала працы. Бегагаспадарчасьць тармозіць своячасовы пуск фабрыкі-кухні, якая павінна абслугоўваць усіх рабочых вузла.

Самым абураючым фактам зьяўляецца тое, што на вузьле фактычна няма нівочнай пральні для рабочых. Адзіная пральня абслугоўвае толькі ўстановы і сталовыя.

Жыльлёвае пытаньне—самае балючае. Да гэтага часу рабочыя з сем'ямі жывуць у вагонах. Імі занята 5 таварных і 8 пляцовых вагонаў. Спэцыялам рабочыя забясьпечваюцца перагулярна.

Недахопы ў правядзеньні гаспадарчага разрахунку

На гаспадарчы разрахунак фармальна пераведзены ўсе паравозы, большая частка цэхаў і рамонтных брыгад. Але пазуль што гэта толькі на паперы. Брыгады ня ведаюць расцэнак, ня ведаюць выгадай пераходу на гаспадарчы разрахунак. Улік паказчыкаў разгортваецца сацыялістычнага наступленьня — трунтуецца на шырокіх тэмпах разьвіцьця нашай прамысловай індустрыі.

Пры вялізарным росьце і разьвіцьці ўсіх асноўных галін народнай гаспадаркі, у прыватнасьці, машынабудаўніцтва, транспарту і мэханізацыі сельскай гаспадаркі — асноўныя сыравыя і энэргетычныя базы, якія іх кармяць — вугаль і мэтал — значна адсталі, і становяцца вузкім месцам.

Задача, якая была пастаўлена перад мэталюргіяй у 1931 годзе, — даць краіне ня менш 8 млн. тон чыгуну — аказалася нявыкананай. Большасьць прадпрыемстваў не перабудавалася яшчэ поўнасьцю на асноўе шасьці сталінскіх умоў, не навялі рашучай барацьбы за ліквідацыю абязьлічкі, аўраўнілаўкі, умацаваньне гаспадарчага і тэхнічнага кіраўніцтва на базе адзіначальня і гатыны у жыцьцёвай ступені абумовілі адноўныя вынікі гаспадарчага году.

Зараз партыя аддае асаблівую ўвагу чорнай мэталюргіі. XVII партканфэрэнцыя ў рэзалюцыі па дакладу тав. Арджанікідзэ зазначыла, што: «Цэнтральнай задачай усяго народнагаспадарчага пляну на 1932 год зьяўляецца выкананьне вытворчай і будаўнічай праграмы па чорнай мэталюргіі, вугалі і машынабудаўніцтве», што «кпярмэнаньне адставаньня чорнай мэталюргіі зьяўляецца першай кардынальнай задачай прамысловага пляну».

Плян 1932 году прадугледжвае шырокую работу апіклівова па ўсіх лініях: на лініі максымальнага выкарыстаньня існуючых агрэгатаў шляхам правільнай арганізацыі працы і вытворчасьці, рацыяналізацыі і рэканструкцыі і на лініі грандыёзнай, небывалай у гісторыі, праграмы будаўнічых работ.

1932 год павінен быць годам стварэньня магутнай мэталюргічнай і вугальнай базы. Імкнна таму партыя і ўрадам канцэнтруюцца на гэтым вучастку сілы і сродкі.

Аб'ём капітальных затрат у мэталюргіі з году ў год узрастае. Так, калі ў 1928-29 годзе яны раўняліся 240 млн. руб., дык ужо ў 1929-30 годзе —415 млн. руб., у асобным квартале 1930 году — 145 млн. руб., у 1931 годзе — 1.027 млн. руб і ў 1932 годзе будуць раўняцца 1.800 млн. рублёў.

Такім чынам, аб'ём затрат на 1932 год перавышае на 75 проц. затраты 1931 году і раўняецца ўсёй суме сродкаў, укладзеных у мэталюргію за гады рэканструкцыйнага пэрыяду.

Матар'яльна - тэхнічным зьместам гэтых пазначаных вялічэнь служаць: пабудова першай чаргі Магнітагорскага заводу з 6 доменнымі печамі, 10 мартэнамі, 2 блюмінгамі і 7 пракатнымі станамі; пуск Кузьнецкага заводу з 4 доменнымі печамі, 9 мартэнамі, 1 блюмінгам і рэйкабалачным станам; пуск 2 доменных, 2 мартэнаўскіх печаў на заводзе «Азовсталь»; пуск 2 доменных, 8 мартэнаўскіх печаў, блюмінгу, інструментальнага цэху і заводу ферасплаву на Дняпрасталі; падрыхтоўка да пуску доменных печаў на Крывазоскім, Н.-Тагільскім і Нова-Тульскім мэталюргічных гігантах; пуск 7 доменных, 18 мартэнаўскіх печаў, 2 блюмінгаў і 5 пракатных і трубных станаў на заводах Сталіна, якія дзейнічаюць і рэканструюцца.

Усяго, паводле пляну, на так званай галіцкай мэталюргіі павінна ўвайсьці ў работу ў 1932 годзе 24 доменныя печы, 51 мартэнаўская печ, 7 блюмінгаў, 21 пракатны стан, і 5 трубных станаў.

Да канца 1932 году рад іншых заводаў на сваёй магістрасьці зойдуць адно з першых месяц у радзе заходнеэўрапэйскіх і амэрыканскіх прамысловых прадпрыемстваў.

Аб тым, якія яканыя зрухі абудуцца ў нас у выніку капітальных работ 1931 і 32 г. г., аб тым, як змяніцца тэхнічны твар нашай мэталюргіі можна меркаваць хаця-б па тым, як змяніцца сярэдні аб'ём доменных печаў. Калі ў нас яшчэ пядаўна пераважалі доменныя печы ў 90 кбм. аб'ёму (Выксунскі завод, Уральскі завод) і нават у 30 кбм. (Гур'еўскі завод), дык цяпер вырастаюць доменныя печы гігантаў сацыялістычнай буды — доменныя печы Магнітагорску, якія маюць аб'ём 1.200 кбм., Дняпрасталі — 930 кбм., Кузьнецку — 840 кбм. і г. д. Кожная доменная печ Магнітагорскага заводу пры аб'ёме ў 1.180 кбм., мае карысную вышыню — 32 кбм. і дыямэтр горна — 7,5 метр. Гэта будуць самыя магутныя доменныя печы ў сьвеце.

Ня меншую значасьць маюць паказальнікі тэхнічнай рэвалюцыі ў мартэнаўскай справе.

100-тонныя мартэнаўскія печы, якія пачаліся ў нас да гэтага часу літаральна адзінкамі (2 печы на заводзе імя Дзяржынскага), робяцца ў бліжэйшыя годы цэнтральнай фігурай Магнітагорскага цэху. 1932 год кладзе пачатак гэтай справе.

У 1932 г. павінны будуць увайсьці ў работу 39 статонных і 2 двухсотвагонасьцітовыя мартэнаўскіх печы. У 1932 г. у пярэдзіні ў Саюзе будуць пушчаны ў ход мартэнаўскія печы, якія качаюцца — 4 на Дняпрасталі і 2 на Азаўсталі.

Яшчэ большую рэвалюцыю нясе за сабой будаўнічая праграма для нашых пракатных цэхаў.

З пускам 7 магутных блюмінгаў з пракатной здольнасьцю кожнага ў 1.000 тон мэталю зусім па-новаму вырашаецца рад асноўных праблем мэталюргіі — нагрэву мэталю, памяншэньне браку, павялічэньня прадукцыйнасьці чыставых лініі, транспарту балванак, спосабу разьліўкі сталі і інш. Умарнымо кампрацуюць у 1932 годзе бесьперапынна загатоўчыя пракатныя станы з іх гігантскай прадукцыйнасьцю ў 600 тыс. тон у год кожны.

Трэба ўлічыць яшчэ на трубныя станы, якія пачнуць работу ў другой палове 1932 г. на заводах, Таганрогскім, імя Ільіча, Выксунскім і інш.

Гэта грандыёзная будаўнічая праграма, якая ажыцьцяўляе на справе лёзунг партыі аб тэхнічным перааўзбраеньні нашай прамысловасьці, патрабуе ацаблеьнага напружаньня сіл і сродкаў ня толькі ўнутры чорнай мэталюргіі, але і ўсёй народнай гаспадаркі.

У цэнтры ўсяго народна - гаспадарчага пляну, побач з пытаньнямі ўзрыву і транспарту, павінны быць пастаўлены пытаньні забясьпячэньня ўсёй праграмы чорнай мэталюргіі.

Чорная мэталюргія — гэта вядучае зьвяно эканомікі народней гаспадаркі, якое лімітуе зараз яе разьвіцьцё, — павінна пакончыць з адставаньнем.

Значная вытворчая магутнасьць існуючых агрэгатаў, якія пачала пускацца, павінна паводле пляну 1932 году забясьпечыць наступны мінімаў вытворчасьці:

выплавка чыгуну — 9 млн. тон, вытворчасьць сталі — 9,5 млн. тон, выпуск пракату — 6,7 млн. тон.

Гэта дае прырост вытворчасьці да 1931 г. у цэласным вылічэньні (па валавой продукцыі) ў сярэднім ў 82 проц.

Такі тэмп прыросту магчымы толькі па ўмовах савецкай сыстэмы.

У рабоце кожнага заводу (з поўным замкнутым мэталюргічным цыклам) вядучую ролю адыгрывае доменны цэх. Работа доменнага цэху вызначае ў асноўным работу ўнутрызаводскага транспарту — галоўнага нерву заводу (разам з тым палкам ад яго залежачы), вызначае работу сталяліцейных цэхаў, энэргетычнай гаспадаркі і інш.

Плянам 1932 г. упяршыню пастаўлены і практычна вырашаецца пытаньні падрыхтоўкі доменнай шыхты.

Запраектаваны да будаўніцтва з пуску 4 магутных фабрыкі для аглёмэрацыі (сьпяканьня) руд сыстэмы Дзайт-Лойд з гадавой прадукцыйнасьцю 860 тыс. тон кожная.

На заводах імя Томскага і Дзяржынскага гэтыя фабрыкі ўжо будуцца і будуць пушчаны ў другім паўгодзьдзі 1932 г. Дзьве пастуныя за імі фабрыку запраектаваны на заводзе **імя Варашылава і Рыкава**, увойдуць у работу ў 1933 г. У сярэдзіне 1931 году ўведзена ў работу руда-сартовая шэя фабрыка на **ст. Верхоўцава каля Крывога Рогу.**

Рашаючае значэньне для работы доменнага цэху мае ажыцьцяўленьне мэханізацыі загрузкі домнаў. Работа ў гэтым галіне ўжо пачата. Новыя пушчаныя ў бягучым годзе доменныя печы поўнасьцю мэханізаваны як у адносінах загрузкі, так і разьліўкі. Упершыню ў Саюзе пастаўлена ў бягучым годзе на заводзе імя Томскага машына для разьліўкі чыгуну. Месяц таму назад пачала працаваць на заводзе імя Рыкава такая-ж разьлівачная машына ўласнага вырабу. У 1932 г. 12 такіх машын павінны працаваць на заводах поўдня. Усе печы, якія пачаў пускаюцца, поўнасьцю абталіваны загрузачнымі і разьлівачнымі прыладамі — бункерамі, кавшовымі кранамі, разьлівачнымі машынамі. Пазвычай важнае для работы доменнага цэху пытаньне — **якасьць коксу**, які пастаўляецца.

У 1931 г. коксавая прамысловасьць ня выканала ўзятых на сябе перад мэталюргіяй абавязацельстваў. Якасьць коксу паводле пляну павінна была вызначацца наступнымі показальнікамі: попелу — на 10 проц., серкі—1,7 проц., вільгаці — 6 проц. На самой справе, якасьць аказалася значна ніжэй пляну. Узмоцненая работа вугля-мыйк у 1932 г. дае магчымасьць запраектаваць на пяцігадзьдзе год пекалькі паніжаны процант попелу.

З агульнай колькасьці намечаных да выплаўкі 9 млн. тон, домны павінны даць: ліцейнага чыгуну — 2,1 млн. тон, спэцыяльных чыгунаў — (фэра-марганца, фэра-сіліцыя, шпіегеля і інш.) — 375 тыс. тон і перадзельнага чыгуну — 6.650 тыс. тон.

Гэту колькасьць перадзельнага чыгуну разам з ломам павінны перапрацаваць нашы сталяліцейныя цэхі і выпусьціць для патрэб пракату 9,5 млн. тон сталі.

Мартэнаўскія цэхі зьяўляюцца ў нас зараз, бадай, самым хворым, самым вузкім месцам.

Для агульнай характарыстыкі работы сталяліцейных цэхаў у 1932 г. трэба адзначыць значнае павышэньне ў агульнай выплаўцы ўдзельнай вагі якасных сталей. Выплаўка аўтатрактарных, вугляродзістых, храмаікелявых сталей цьвёрда ўкараняецца ў практыку работы сталяліцейных цэхаў. Пуск у 1932 г. зарада мартэнаў яшчэ 11 электропечаў забясьпечыць пачатак стварэньня мощнай тэхнічнай базы для выробу якасных сталей. Усяго павінна быць выплаўлена ў 1932 годзе 850 тыс. тон якасных сталей, з тым, каб даць каля 600 тыс. тон якаснага пракату.

Агульнае заданьне **па пракаце на 1932 г.** вызначана ў памерах 6.660 тыс. тон, у тым ліку на існуючых станах — 5.725 тыс. У асноўным існуючыя станы для гэтай праграмы падрыхтаваны.

Адной з рашаючых умоў для забясьпячэньня пляну зьяўляецца вялікая закладнасьць у арганізацыі кіраўніцтва як асобнымі прадпрыемствамі, так і ўсёй галіной прамысловасьці. Пастанова партыі аб разбудаваньні «Сталі» на два аб'яднаньні — Данбаскае і Дняпрапятроўскае, вызначэньне ў спэцыяльны апарат кіраўніцтва поўнабудоўлі, мела сваёй мэтай паліпшэньне тэхнічнага кіраўніцтва на прадпрыемствах, канцэнтрацыю ўвагі кіраўнікоў прадпрыемстваў на ходзе жэлезабэтаннай дзейных агрэгатаў.

Вынікі апошніх месяцаў работы гавораць аб наступаючым пераломе ў ходзе вытворчасьці. Паўдзённая мэталюргія дасягнула ўжо ў студзені 97 проц. пляну. Некалькі адстае Урал. Зараз на заводах разгарнулася магутная палітычная кампанія за выпрацоўку пляну—за дадатковы 1 млн. тон чыгуну і забясьпячэньне выплаўкі ў 1932 г. 10 млн. тон.

Вялізарная актыўнасьць рабочых мас, якая разгарнулася вакол гэтага пытаньня, накіравана ў напрамку тых пытаньняў фундаментальных сустрэчных намаганьняў і барацьбы за арганізацыю гаспадарча-разрахунковых брыгад, што зьяўляюцца адной з найбольш дзейных форм рэалізацыі 6 сталінскіх умоў.

Барацьба з апартуністычным замаруджваньнем тэмпаў, мощнае бальшавіцкае, гаспадарчае і тэхнічнае кіраўніцтва, гаспадарчы разрахунак, забясьпячэньне вытворчых патрэб прадпрыемстваў, усё гэта на базе сацыялістычнага палепшэньня мэтадаў арганізацыі працы і выкарыстаньня рабочай сілы забясьпечыць выкананьне пляну чорнай мэталюргіі 1932 году.

Поўнасьцю ажыцьцявіць праграмы рэканструкцыі камунальнай гаспадаркі

Фарсаваць жыльлёвае будаўніцтва Віцебску

За апошнія гады дасягнуты значныя посьпехі ў сацыялістычнай рэканструкцыі камунальнай гаспадаркі г. Віцебску. Жыльлёвая плошча за кошт будаўніцтва новых дамоў павялічана на 29.000 кв. мэтраў. Пракладзена новая вадаправодная магістраль адлегласьцю ў 6 кілёмэтраў, праведзены трамкійныя лініі ў прамысловыя раёны гораду. Будуюцца лазьня-прачэчны камбінат, больніца і мост праз раку Заходнюю Дзьвіну.

Аднак, пагоруль камунальная гаспадарка адстае ад росту патрабаваньняў рабочых мас гораду. За перыяд з 1 студзеня 1929 г. па 1 студзеня 1932 г. колькасьць рабочых павялічылася амаль на 20.000 чал. За гэты-ж час жыльлёвая плошча ўзрасла толькі на 18.000 кв. мэтраў. Калі ўлічыць, што да канца 1932 г. рабочае насельніцтва гораду ўзрасьце да 130.000 чал., дык напружанае становішча з жыльлёвай плошчай стане зусім відавочным.

Рост прамысловасьці гораду ставіць у якасьці баявой задачы максымальнае разгортваньне ў 1932 годзе жыльлёвага будаўніцтва.

Вадаправодная сетка набудавана толькі ў цэнтры гораду. У рабочых раёнах вадаправоду няма. Калі вялікі раён, як Пралетарская Слабада, дзе жыве больш 10.000 рабочых, прымушан карыстацца вадой са студняў і калак рэкі. Для задавальненьня патрэб насельніцтва ў вадзе трэба мець магістральную сетку ў 220 клм.; існуючая сетка дасягае 35 клм. Вадой з вадаправоду карыстаюцца толькі 27 проц. домаўладаньняў гораду.

Каб забясьпечыць горад вадой трэба пракласьці новыя магістралі і адрамонтаваць старыя, што прыйшлі ў непрыгодасьць. Побач з гэтым, неабходна капітальная рэканструкцыя вадакачкі, якая дае ў суткі ўсяго толькі 5.000 кбм. вады.

На гораде пракладзена 16,5 клм. трамвайных лініі, пры чым 7 клм. набудаваны яшчэ ў 1897 годзе і патрабуюць капітальнага рамонту. Ёсьць 26 трамвайных вагонаў, але працуе ўсяго толькі 14. Каб задаволіць патрэбы рабочых гораду ў трамваі, неабходна мець яшчэ 30 трамвайных вагонаў.

Неадкладальнае плянаваньне гораду і зусім невыстарчальная ўвага да дрэнаасэнізацыяньняў прывялі да таго, што горад мае зусім незначную колькасьць паркаў і скваў, дзе 6 рабочых мае адпачынак у вольны час. У разе рабочых раёнаў яшчэ не забруківаны вуліцы. Плян брукаваньня ў 1931 годзе быў выкананы толькі на 43.6 проц.

Электрычнасьцю забясьпечана ня больш 30 проц. кватэр. Значная частка акраін яшчэ дагэтуль ня мае электраэнэргіі.

Горад налічвае 5 лазьняў, якія прапускаюць за год 1 мільён чал. Лазьні гораду ні ў якім разе ня могуць задаволіць патрэбы працоўнага насельніцтва. Будуецца новы жыльня-пральны камбінат з гадавой прапускной здольнасьцю ў 1 млн. чал. Будаўнічыя работы трэба фарсаваць, каб скончыць іх у самы бліжэйшы час.

Незадавальняючае стаіць справа з абслугоўваньнем насельніцтва пральнямі. Зараз у горадзе няма ні адной механізаванай пральні. Толькі ў канцы першага кварталу мяркуецца пусьціць у ход новую мэханізаваную пральню з прапускной здольнасьцю ў 5.000 кілёграм бялізны ў дзень пры 2-хзменнай рабоце, але і яна задаволіць патрэбы працоўнага насельніцтва толькі на 20 процантаў. **Неабходна пабудаваць яшчэ адну мэханізаваную пральню.**

Гарсавет выпрацаваў зараз праграму значнага паляпшэньня камунальнай гаспадаркі ў 1932 г. Прадугледжваецца павялічэньне жыльлёвай плошчы на 180 тысяч кв. мэтраў, у жыльлёвае будаўніцтва ўкладзецца 8.400.000 руб. На паляпшэньне вадаправоду, каналізацыі, трамвайнай сеткі, аўта-транспарту, лазьняў і пральні і інш. асигнавана 5.428.000 руб., на паляпшэньне дабрабыту гораду ацэнічана 700.000 руб. Праграма камунальнага будаўніцтва ў 1932 г. павінна быць выкананa поўнасьцю.

Ж. і В.

ГАРАДЗКАЯ ГАСПАДАРКА БАБРУЙСКУ—АДСТАЛЫ ВУЧАСТАК

Бабруйск мае рад дасягненьняў у разьвіцьці камунальнай гаспадаркі. За кончана будаўніцтва дому-камуны на 208 кват. Набудован вялікі дом на 186 кватэр, большая, ванэрыварная лячэбніца; скончана набудова гарадзкара тэатру на 1200 месц. Пашыраюцца электрычная станцыя, сетка вадаправоду і інш. Але ўсе гэтыя посьпехі ня могуць поўнасьцю задаволіць узросшых патрэб працоўных мас гораду.

Асаблівае дае сябе адчуваць недахват кватэр. У інтэрнаце дроваапрацоўчага камбінату, напрыклад, з-за недахвату жыльлёшчы, ложкі бываюць заняты поўныя суткі, бо на адным і тым жа ложку сьпяць рабочыя трох зьмен. Аднак, гарсавет ня прымае мер па будаўніцтве новых рабочых пасёлкаў, на выселеньні з жакгаўскіх дамоў нятмавскіх элементаў. Апошнія яшчэ дагэтуль жывуць у жакгаўскіх домах, а ўласныя звяюць у арэнду. Так, на вуліцы К. Маркса, у доме № 66 (жакгаўскі) жыве былы купец, які да гэтай-жа вуліцы мае свой уласны дом (№ 64) і на працягу 7 год здае яго ў арэнду. Падобных фактаў можна знайсьці шмат і на іншых вуліцах Бабруйску.

Зусім недастаткова абслугоўваецца гарадзкое насельніцтва лазьняй і пральняй. У гораде ёсьць толькі 1 лазьня, якая надзвычай перагружана і ў суткі з гэтым утрымліваецца ў антысанітарным становішчы.

З-за бязьдзейнасьці гаркамгасу плян брукаваньня вуліц у 1931 годзе выкананы толькі на 5,3 проц. Ня лепш абстаіць справа і з пракладаньнем тратуараў. Сроднікі, адпушчаныя для гэтай мэты, ня выкарыстаны. У выніку брукаваньня вуліцы і тратуары ёсьць толькі ў цэнтры гораду, у рабочых-жа раёнах іх няма.

Гарсавет і гаркамгас ня прымаюць ніякіх мер супроць зьнішчэньня садоў і зялёных насаджэньняў, якое за апошнія два гады набыло ў Бабруйску масавы характар. Калі за гэты час у горадзе было пасаджана 7.600 шт. дрэў і кустоў, дык сьпішчана звыш 10 тыс.

Дрэнна ў Бабруйску і з ажыцьцяўленьнем сацыянімуму. Бываюць выпадкі, калі вуліцы гораду ператвараюцца ў звалачныя пустэты (вул. К. Лібкнэхта). На гарадзкім рынку больш году ляжала каля 5.000 вазоў гною.

Для таго, каб рапуча палепшыць бытавыя ўмовы рабочых Бабруйскі гарсавет і гаркамгас павінны неадкладна заняцца рэканструкцыяй каму гаспадаркі.

РОСЬЛІК.

Пастаянныя брыгады па пераапрацоўцы ільну

забясьпечылі пасьпяховае скончэньне работы і выкананьне плянаў загатовак

Калгас «Серп і Молат», Канчанскага сельсавету, (Гаралоцкі раён), першым у раёне поўнасьцю выканаў плян загатовак і першым апрацаваў і здаў ільнавалакно дзяржаве.

Па 15 дзён раней тэрміну, 25 лістапада, калгас здаў дзяржаве высокакласнае валакно, пераробленае на 10-12 у колькасьці 46.5 цэнтн., выканаўшы плян па загатоўках ільнавалакна на 102 проц.

Чаму калгас «Серп і Молат» так бліскуча спраўляўся з пераапрацоўкай трасты і раней усіх здаў лён дзяржаве? У чым сакрэт перамогі?

Першае—падрыхтоўка да апрацоўкі ільну. У калгасе правяцілася яшчэ ў часе цераблёньня ільну. Мялі і бўлі былі адрэгулятаваны своячасова. У кастрычніку разгарнулася пасучнае мяцьцё і трапанне ільну. Працавалі 3 брыгады. Работа была арганізавана на аснове зьвязальнічыны.

Але ня ўсё ішло гладка з першых дзён. З пачатку ўстаноўленыя нормы выпрацоўкі выконваліся толькі на 50 проц. Праца тармазілася. Праўленьне стала шукаць прычыны. І прычыны былі знойдзены.

У брыгадзе апынуліся асобныя гультаі, якія ўмела хавалися за плячыма брыгады. Працоўная дысцыпліна была слабая. Мялыцыкі і трапальнічыцы прыходзілі на работу ня ў строга-вызначаны час. Гэта было прычынай перабояў у рабоце, ня поўнага выкарыстаньня машын і прагулаў асобных калгасьнікаў. Улік культаў. Зьвязальнічыца была на фоме, а фактычна—падсёбнічыца. Панавала ўраўнілаўка. Праўленьне калгасу своячасова выявіла і ліквідавала гэтыя недахопы.

1, рашаючым момантам паляпшэньня работы быў пераход брыгад на зьвязальнічыну, з выразнымі нормамі, з дакладным улікам працы як па колькасьці, так і па якасьці. Правільна расставілі сілы, кожная брыгада атрымала заданьне і гэта забясьпечыла ў далейшым бесьперабойны рух ільнянога канвэеру.

Без затрыманьня лён сушыўся, мяўся, трапаўся і адпраўляўся на загатоўчы пункт.

Брыгады складаліся з двух суплыпічыкаў, чатырох мялыцыкаў, 7-9 трапальнічыкаў і 1 сартоўшчыка. У абавязак суплыпічыка ўваходзіла падвозка ільну да сушні, наладжваньне ў бўню, своячасовая і добраякасная сушка трасты. Норма выпрацоўкі ў зьмену—1.5 тоны, за што залічвалася 1.5 працадня.

Мялыцыкі працавалі на дзьвёх прымацаваных да іх 2-хвальных мялках. Норма выпрацоўкі—32 кгр. валакна сыраду на кожнага. За гэта залічвалася па 1.25 працадня.

Нормы выпрацоўкі для трапальнічыц былі вызначаны (між іншым нізкія)—8 кгр., за што залічвалася 1.25 працадня. За перавыкананьне норм выпрацоўкі пры сушцы, мяльцы і трапаньні ільну і за лепшую якасьць работы колькасьць працадзён павялічвалася.

Сартоўка і падвязка былі заключным зьвяном у апрацоўцы валакна. Тут за норму выпрацоўкі было ўзята 80 кгр. і расцэньвалася, як 1,5 працадня.

Такая расстаноўка сіл і выразныя нормы выпрацоўкі заінтэрэсавалі кожнага калгасьніка і паслужылі значнаму ўзьнёсьцю працоўнасьці працы, забясьпечылі бесьперабойную работу ільнянога канвэеру.

Брыгады паміж сабой спаборнічалі на аснове спэцыяльных дагавораў, у якіх былі высунуты сустрэчныя скарочаныя тэрміны скончэньня апрацоўкі: замест 10 сьнежня—25 лістапада. Работа ішла ў дзьве зьмены.

Нормы выпрацоўкі сыстэматычна перавыконваліся. Сацыялістычны дагавор выконваўся і яго выкананьне пераварвалася па пунктах. Расьлі рады ўдарнікаў і ўдарніц. Такія трапальнічыны, як **Навадчая Ксеня, Чарнаўская Волька, Трыфанава Насьця, Савасьцеева Аўгеньня**, сыгнэкатычна апрацоўвалі па 14 кгр. валакна; **Чарнаусава Усьціньня і Савельева Саламея**—па 12 кгр.; мялыцыкі **Бінаў Фядот, Чарнаусаў Мікола, Пятроў Захар** павалі зайсёды сыраду па 48 кгр.; сартоўшчык **Чарняўскі Ягор** даваў замест нормы 5 пуд.—7-8 пуд. 75 гасёвы **дзед Іван** зайсёды даваў добраякаснага высучанага трасту з перавыкананьнем нормы на 50 проц.

Калгас прыкладна выканаў свае абавязацельства, скончыўшы апрацоўку і рэалізаваўшы плян загатовак да 25 лістапада. За ўдарную работу і патэрміновую здачу працаўцы дзяржаве калгас атрымаў прэміі ў суме 1000 руб.

Свой вопыт працы калгас «Серп і молат» пераносіць у адстаючыя калгасы. Зараз-жа, ня толькі была скончана апрацоўка ільну, калгас «Серп і молат» выпучыў буксірную брыгаду з лепшых ударнікаў і пазіраваў яе на дапамогу адстаючаму калгасу імя Чарвякова.

У калгасе імя Чарвякова буксірная брыгада знайшла, што пастаянныя брыгады ня створаны, мялкі і бўлі абязьлічаны, нормы выпрацоўкі выконваюцца на 50 проц. і г. д. Па прыкладзе свайго калгасу буксірная брыгадай былі створаны пастаянныя брыгады, увядзена выразная зьвязальнічына, з цьвёрдымі нормамі выпрацоўкі, правільна расстаўлены сілы, ліквідавана абязьлічка. На другі дзень пасьля прыезду буксірнай брыгады пачацца пералом. Нормы выпрацоўкі сталі **рэальнымі**, знайшліся ўдарнікі, якія іх сталі перавыконваць. Перадавыя брыгады выклікалі на спаборніцтва адстаючых, якія ня так хутка асвойвалі перабудову работы па-новаму.

Пры такімсамым буксірнай брыгады калгас імя Чарвякова выйшаў на перадавую лінію, дабіўся поўнай перамогі ў апрацоўцы трасты і здачы таварнай прадукцыі дзяржаве.

Такім жа чынам «сяброўская» буксірная брыгада калгасу «Серп і молат» пераехала ў буйны ільнавочны калгас «Чырвоны пуцілавец», Віраўлянскага сельсавету. Тут фармальна існавалі брыгады і была ўведзена зьвязальнічына. Але толькі фармальна. Пераапрацоўка ільну ішла марудным тэмпам. Нормы таксама ня выконваліся. Брыгадзе прыйшлося больш ільна прыгаварваць да неахоткі. У гэтым калгасе пачкочна дзейнічала агэнтура кулака. Па прыкладзе буксірнай брыгады пачаліся рэйды.

Буксірная брыгада вырыло вулкану двойнасьць і на справе паказала, як трэба працаваць, каб скончасова пераапрацаваць лён і ў тэрмін здаць валакно дзяржаве. Праверныя мэтады на практычнай рабоце паказаныя ўжо калгасаў і тут сябе цалкам апраўдалі. Калгас «Чырвоны пуцілавец» з посьпехам спраўляўся з пераапрацоўкай ільну ў значнай меры дзякуючы дапамозе буксірнай брыгады.

«Саўрэт» працы ўдарнікаў калгасу «Серп і молат» крыецца ў правільнай арганізацыі работы на аснове зьвязальнічыны, ліквідацыі абязьлічкі, на аснове разгортваньня сацыялістычных мэтадаў працы—сацыяборніцтва і ўдарніцтва.

Сьледаваць прыкладу калгасу «Серп і молат» абавязак кожнага калгасу БССР.

М. ВІШНЕЎСКІ.

С. БЕЛІЧ

ЧОРНАЯ МЭТАЛЮРГІЯ Ў ЗАКЛЮЧНЫМ ГОДЗЕ ПЯЦІГОДКІ

Пасьпяховае выкананьне пяцігодкі —пляну разгорнутага сацыялістычнага наступленьня — трунтуецца на шырокіх тэмпах разьвіцьця

Перад рашаючай схваткай за Шанхай

Японія сьцягвае значныя сілы

Адпраўка новых японскіх дывізій у Шанхай

ТОКІО, 14. Ваеннае міністэрства апублікавала паведамленьне, што побач з адпраўкай 9-й дывізіі ў Шанхай выслана яшчэ **зьмешаная брыгада 12-й дывізіі Куруме.** У заяве гаворыцца, што сёньня Уэда (камандуючы японскімі войскамі ў Шанхаі) перадасьць камандаваньню кітайскіх войск ультыматум з тым, каб пачаць дзеяньні «больш шырокага маштабу».

40 тысячная японская армія ў Шанхаі

ШАНХАЙ, 15. Учора скончылася высадка людзкога саставу японскай дывізіі, прыбыўшай у Шанхай. Зараз выгружаецца артылерыя, коні і інш. рыштунак дывізіі. Выгрузка павінна скончыцца заўтра. Афіцыяльных паведамленьняў аб колькасьці прыбыўшых войск няма, аднак, вядома, што в часьцямі японскай дывізіі, якія прыбылі з Кіруму і Каназава, у Шанхаі налічваецца ад **35 да 40 тыс. японскіх салдат і матросаў.** Прыбыўшыя войскі прайшлі ўмацаваны раён Усуна без адзінага стрэлу з боку кітайцаў. Японскі штаб учора выпусьціў неафіцыяльнае паведамленьне, якое прапануе вывесьці кітайскія войскі з вакольц Шанхаю. У паведамленьні заяўляецца, што ў адваротным выпадку японцы «вымушаны» будуць ужыць крайнія меры.

„Японцам дыплёматыя нёпатрэбна"

ШАНХАЙ, 14. Па пытаньне, ці ідуць перагаворы паміж прадстаўнікамі дзяржаў з аднаго боку і кітайскімі і японскімі прадстаўнікамі—з другога, **Намура (камандуючы японскімі войскамі ў Шанхаі)** адказаў, што «няма перагаворы не адбываюцца, бо **японцам больш непатрэбна дыплёматыя. Кітайскія войскі павінны быць узброенай рукой адкінуты на 30 міль ад Шанхаю».** Невялікія сутычкі адбываліся на працягу дня на Чапэйскім і Усунскім франтох (ТАСС).

1.300 японскіх салдат захоплены ў палон

ШАНХАЙ. Японская канапэрка ўвайшла ў вусьце ракі Вампу і пачала бамбардыроўку кітайскіх пазыцый. Адначасова эскадрыльля японскіх самалётаў, якая прыбыла ў раён Усуна, устанавіла дымавую заслону, пад прыкрыцьцём якой значны атрад японскіх войск высадзіўся на бераг каля Усунскіх фартоў. Згодна кітайскіх паведамленьняў, **1.300 японскіх салдат, што высадзіліся каля фартоў, захвачаны ў палон.**

Камісія Лігі нацый, не знайшла вінаватага

ЖЭНЭВА, 14. Апублікаван другі даклад шанхайскай камісіі Лігі нацый, у якім разглядаюцца падзеі з 1 студзеня. Аўтары дакладу, стараючыся **ўсямерна зьменшыць адказнасьць японцаў** і падкрэсьліваючы ў прыват насьці **немагчымасьць устанавіць, хто першы парушыў перамір'е,** прыгушаны аднак канстатаваць, што з 3 лютага ў паяўнасьці—адкрытая вайна. Наступаюць японцы.

Далей, у дакладзе гаворыцца, што «японскія морскія ўлады ўзялі ў свае рукі кантроль над кварталам міжнароднай канцэсіі. Яны разброілі паліцыю і паралізавалі муніцыпальную дзейнасьць. Муніцыпальная рада прымушана была эвакуяваць школы і шпіталі. Марской пяхотай і мабілізаванымі японскімі грамадзянамі былі выкліканы шматлікія эксцэсы, прычым яны праводзілі расстрэлы бяз суда. У рэзультаце стварылася царства тэрору і амаль усё нежпонскае насельніцтва кварталу прымушана было ўцячы».

У заключэньне зазначаецца, што камісія ня мае намеру пасьлаць новыя даклады, пакуль ня будзе новых фактаў. (ТАСС).

Капітуляцыя гамінданаўскіх катаў перад акупантамі

ШАНХАЙ, 15. Не падлягае ніякаму сумненьню, што шанкінскія палітыканы ўсіх адценьняў, якія падтрымліваюцца кітайскай буржуазіяй, прагнуць якім-небудзь шляхам дагаварыцца з Японіяй. Гэтыя колы гатовы ісьці **на вялікія ўступкі,** уключаючы адвод кітайскіх войск на 2530 міль ад Шанхаю.

Аднак, войскі адыходзіць не жадаюць і маюць намер праводзіць далей барацьбу. Японцы ведаючы бясьсільле шанкінскіх палітыканаў, ня ўступаюць з імі ў сур'ёзныя перагаворы і лічаць больш патрэбным дабіцца свайго ваеннымі сродкамі. Шанкінскія палітыканы абіваюць парогі прад стаўнікоў дзяржаў, асабліва Амэрыкі, з просьбамі знайсьці выхад са становішча.

Некаторыя замежныя наглядальнікі лічаць, што, калі кітайская армія будзе разьбіта, то яна адыйдзе ад Шанхаю і будзе працягваць партызанскую вайну. Гэта, на думцы наглядальнікаў, прымусіць японцаў утрымліваць доўгі час вялікую колькасьць войск што зьвязана з непасільнымі для цяперашняга фінансавага становішча ў Японіі расходамі. Адсюль жаданьне японцаў як-небудзь уцягнуць у шанхайскую авантуру замежныя дзяржавы, каб падзяліць адказнасьць і расходы.

Нанкінскі ўрад выдаў загад аб звароце ў Нанкін 8 аэраплянаў, раней накіраваных у Шанхай на дапамогу 19-ай кантонскай армії. У кітайскіх колах указваюць, што гэты акт зьяўляецца новым доказам пастановы Чан Кай-шы не аказваць супраціўленьня японскім войскам. (ТАСС).

Буйныя японскія заказы на заводах „Шкода"

БЭРЛІН, 14. Буржуазная «Б. Ц. Ам. Морген» паведамляе, што нядаўна заводы «Шкода» адправілі ў Японію **18.000 гранат,** у тым ліку **2.000 капоўненых атручанымі газамі.** За апошні тыдзень японская ваенная місія дала фірме «Шкода» **вялікі заказ на розны ваенны рыштунак.** Прасная газэты распэньваюць кошт заказу на **суму звыш 120 млн. чэха-славацкіх крон.**

Забастовачны рух у Японіі

ТОКІО, 14. Паводле даных міністэрства ўнутраных спраў, лік зарэгістраваных канфліктаў паміж рабочымі і прадпрыемцамі ў 1931 г. значна павялічыўся ў параўнаньні з 1930 г., а іменна 2146 канфліктаў супроць 1823. У канфліктах у 1931 г. удзельнічала **142 тыс.** рабочых супроць **122 тысяч** у мінулым годзе. Найбольшая колькасьць канфліктаў (479) узьнікла з прычыны пратэстаў супроць звальненьняў рабочых, 376—супроць скарачэньня зарплаты.

Адначасова павялічыўся лік канфліктаў з прычыны патрабаваньняў павышэньня заработнай платы (268 канфліктаў).

Падаўжэньне тэрміну здачы полісаў страхавому таварыству „Н'ю-Ёрк"

У гутарцы з кіраўніком новаарганізаванай у г. Менску Беларускай канторы акцыянэрнага таварыства «Крэдытбюро т. Шэрманам, апошні паведаміў, што адкрыцьцё тут канторы дык давалася неабходнасьцю найхутчэйшага і пераарэднага абслугоўваньня грамадзян, якія маюць спадчынныя ці іншыя прэтэнзіі за мяжой і спагнаньні, узнагароды па полісах страхавога таварыства «Н'ю Ёрк», **тэрмін здачы якіх (полісаў) прадоўжан да 1 красавіка г. г.**

Апрача таго, мяркуецца таксама пасьпяхова скончыць працэс, які вядзецца за мяжой са страхавым т-вам **«Эквітэбль»,** полісы якога будуць зараз-жа прымацца, але з далейшым (пасьля сканчэньня працэсу) афармленьнем.

На пытаньне ці могуць разьлічваць на атрыманьне страхавой премії асобы, згубіўшыя полісы, т. Шэрман адказаў, што згуба ці зьнішчэньне полісу **не перашкаджаюць атрыманьню ўзнагароды** пры афармленьні заяў грамадзян канторай «Крэдытбюро».

Тав. Шэрман паведаміў таксама, што «Крэдытбюро» ўвайшло ў параўменьне з усесаюзным аб'яднаньнем «Торгсін» аб выплаце апошнім 75 проц. атрыманай па полісах сумы ад таварыства «Н'ю-Ёрк» таварамі з магазынаў «Торгсіну» ў любым горадзе, дзе яны ёсьць.

Па пытаньні абслугоўваньня канторай «Крэдытбюро» раёнаў БССР тав. Шэрман заявіў, што апрача прыёму полісаў на месцах аддзяленьнямі Дзяржаўнага банку, апчадкасамі, такі будзе праводзіцца спэцыяльна камандыраванымі на месцы работнікамі.

ПРЫВІТАНЬНІ БДТ-2

За бальшавіцкую ідэйнасьць у мастацтве

Галоўмастацтва НКА БССР вітае БДТ-2 у дзень пяцігадовага юбілею.

БДТ2 у апошні час стаў на шлях перабудовы сваёй работы, на шлях стварэньня беларускага пралетарскага тэамастацтва — нацыянальнага па форме і сацыялістычнага па сваім зьмесьце.

Задачай БДТ-2 зьяўляецца барацьба за бальшавіцкую ідэйнасьць у мастацтве, за мастацтва бальшавізму. Дасягнуць гэтага можна толькі, аўладаўшы дыялектыка-матэрыялістычным творчым мэтадам, у змаганьні разам з пралетарыятам пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, за хутчэйшую перабудову сацыялізму.

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б — за Магнітабуды мастацтва.

Галоўмастацтва НКА БССР
ГУРСКІ, ШАМШУР, ПОЗЬНЯК.

Узбройвайцеся марксызмам-ленінізмам

Беларуская Асацыяцыя Пралетарскіх Пісьменьнікаў шчыра вітае БДТ-2 з пяцігодзьдзем барацьбы за пралетарскі тэатр.

Няхай мацнее сувязь БелАПП'у з тэатрам.

Узбройвайцеся марксызмам-ленінізмам у змаганьні за бальшавіцкае мастацтва.

Сакратарыят БелАПП'у.

ПРАЦУЙЦЕ ПА-БАЛЬШАВІЦКУ

Прэзыдыум ЦСПСБ шчыра вітае калектыў работнікаў і грамадзкія арганізацыі БДТ-2 з 5-цігадовым юбілеем.

Правільнае кіраўніцтва КП(б)Б і увага пралетарскай грамадзкасьці да жыцьця і работы БДТ-2 далі магчымасьць тэатру выправіць грубыя палітычныя памылкі першых гадоў свайго існаваньня і выйсьці на правільны шлях будаўніцтва нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьмесьце культуры, на шлях актыўнага змаганьня за вялікае бальшавіцкае мастацтва.

Задачай культурнай рэвалюцыі, як суставной часткі ўсяго сацыялістычнага будаўніцтва, патрабуе яшчэ большай сувязі тэатру з рабочымі масамі фабрык і заводаў, яшчэ большага разгортваньня пралетарскай крытыкі і самакрытыкі, сапраўднай бальшавіцкай работы калектыву і грамадзкіх арганізацый БДТ-2 па перабудаваньні тэатру ў мастацкі агітпроп нашай партыі.

НЯХАЙ ЖЫВЕ КП(б)Б—ПРАВАДЫР І АРГАНІЗАТАР САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА!

НЯХАЙ ЖЫВЕ ВЯЛІКАЕ БАЛЬШАВІЦКАЕ МАСТАЦТВА!

ПРЭЗЫДЫУМ ЦСПСБ.

ЮБІЛЯРУ

Вітаем з 5-цігодзьдзем самастойнай работы. Жадаем стаць у першыя рады ў барацьбе за пралетарскую культуру.

КАМАКАДЗЭМІЯ СССР.

Вітаем братні тэатр на парозе 6-га году існаваньня. Наперад да новых перамог у барацьбе за бальшавіцкае мастацтва!

УКРАІНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР «БЕРЕЗІЛЬ».

Замацоўвайце першую і шырока разгортвайце другую пяцігодку. Жадаем новых перамог. Мы з вамі плячо ў плячо ў змаганьні за бальшавіцкае мастацтва. Гонар і слава юбіляру!

УКРАІНСКІ ТЭАТР ІМЯ ЗАНЬКАВЕЦКАЙ, ЗАПАРОЖЖА.

ВЕЛИКІХ УСПІХИВ ВАМ В ГАЛУЗІ ВЕЛИКОГО БІЛЬШОВІЦКОГО МІСТЕЦТВА, ВЯЛИКІЙ ПРИВІТ ВАМ ВСІМ, ВЕЛИКОГО ЗДОРОВЛЯ, ДОЖІТИ ВАМ СТОЛИТНЬОГО ЮБІЛЕЮ.

ОСТАП ВИШНЯ.

***

У рэдакцыю «Зьвязды» на імя БДТ-2 паступілі прывітальныя тэлеграмы: ад партыйнай ячэйкі, дырэкцыі, мясцкому, мастацтва—палітычнага савету і калектыву актораў КІЕЎСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АКАДЭМІЧНАГА ТЭАТРУ ОПЭРЫ І БАЛЕТУ ІМЯ ЛЮБКІНЭХТА; АД ХАРКАЎСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРУ РЭВАЛЮЦЫІ; ад дырэкцыі парт'ячэйкі, мясцкому і калектыву АДЭССКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРУ ОПЭРЫ І БАЛЕТУ; ад рэдакцыі «ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ», ЦК ЛКСМБ і інш.

Да новых перамог!

У эпоху бурнага росту сацыялістычнага будаўніцтва, партыя і савецкая ўлада ставяць перад пралетарскімі тэатрамі вялізарныя і адказныя задачы. Тэатр сваёй мастацкай творчасьцю павінен горача дапамагаць ажыцьцяўленьню пяцігодкі за чатыры гады, пабудове бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва да канца другой пяцігодкі.

Вітаючы з 5-цігодзьдзем, калектыў рабочых і служачых ДВБ упэўнен у тым, што 2-гі Беларускі Дзяржаўны Тэатр у далейшай рабоце будзе яшчэ лепш і больш упарта змагацца за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

Уперад, да новых перамог на фронце будаўніцтва нацыянальнага пралетарскага тэатру!

КАЛЕКТЫЎ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ ДВБ.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

На рашаючых вучастках

ВУГАЛЬ. 12 лютага па Саюзе здабыта 190.392 тоны вугалю, 13 лютага па Данбасе здабыта 135.933 тоны.

ТРАКТАРЫ. 13 лютага харкаўскі трактарны завод выпусьціў 51 трактар і 66 матораў. Маскоўскі аўтазавод імя Сталіна (АМО) даў 41 аўтамашыну.

МЭТАЛЬ. 11 лютага па Саюзе выплаўлена 14.034 тоны чыгуну і 12.951 тона сталі (без малой мэталюргіі).

Выпуск савецкіх трансфарматараў

МАСКВА. Трансфарматары, з сярдэчнікамі з савецкага жалеза выпушчаныя маскоўскім электразаводам далі ў рабоце бліскучыя вынікі. Вызваленьня ад імпарту трансфарматараў удалося дабіцца, дзякуючы энтузіязму рабочых Верхня-Ісецкага заводу, якія прыслалі партыю жалеза, што па якасьці перавышае імпартнае. Каб даць магчымасьць верхня-ісецкам пашырыць вытворчасьць высока-якаснага жалеза, калектыў электра-заводу выпускае звыш пляну адну дэсяцітонную сталяплавільную электрапеч і трансфарматар да яе.

Пробка з сасновай кары

МАСКВА. Інстытут матар'ялаў НКПЗ дабіўся атрыманьня пробкі з сасновай кары. Квадратны мэтр імпартнай пробкі каштуе 5 р. 05 кап., а савецкай—40 кап.

Новы кравельны матар'ял

Трэст дахавых і ізаляцыйных матар'ялаў выпусьціў вопытную ўстаноўку для вырабу дахавага матар'ялу —сфагнашыфэра, паводле спосабу тэхніка Цімафеева.

Сфагнашыфэр вырабляецца з недыфіцытнага сырцу—верхняга пласта торфу, з таннага цэменту. Торф і цэмэнт перамешваецца ў бэтона-мяшальцы, пасьля прэсоўкі і сушкі маса прапітваецца асфальтам і гудронам.

Сфагнашыфэр не прапускае вады, не гарыць і ня зношваецца, што дае права называць новы дохавы матар'ял «вечным дахам».

Завод „Камунар"—за першую дэкаду лютага

За першую дэкаду лютага завод «Камунар» (Менск) выпрацаваў 40 варштатаў «Сьмірнова», або 16 проц. месячнага пляну і 611 цісковў—17,9 проц. Па ўсіх астатніх відах прадукцыі вырабляюцца паасобныя дэталі.

Абутак

За пяціднеўку з 9 па 14 лютага **менская абутковая фабрыка** выпусьціла 12.121 пару абутку, або 60,1 проц. пляну. Прычына недавыкананьня пляну—прастой фабрыкі з-за недахвату сырцу. Адхіленьне ад першага гатунку дасягае 13 проц. супроць плянавых—15 проц.

ПА ЧУЖОЙ УКАЗЦЫ

Узаемаадносіны паміж бліжэйшымі суседзямі Савецкага Саюзу — Польшчай і Прыбальтыцкімі дзяржавамі ня могуць ня цікавіць савецкую грамадзкасьць. Аналіз гэтых узаемаадносін выяўляе з вялікай наглядняцьцю дзьве лініі заменнай палітыкі. З аднаго боку мы бачым палітыку Савецкага Саюзу, які імкнецца ўмацаваць мірныя адносіны са сваімі суседзямі. З другога боку мы назіраем палітыку польскіх мілітарыстаў, якія пад прыкрыцьцём фраз аб сваім міралюбі, **вядуць тыпова імпэрыялістычную, зах ватніцкую палітыку.** Гэта сутычка дзьвюх ліній у заменнай палітыцы, асабліва пачынае праяўляцца ў адносінах да Латвіі.

Савецкі Саюз пасьля падпісаньня ў 1930 г. мірнага дагавору з Латвіяй, які зьяўляе асновай савецка - латвійскіх адносін, пашыменка праводзіў у адносінах да Латвіі палітыку міру і імкнуўся да ўмацаваньня прыязьдзкіх адносін з ёю.

У 1927 г. Савецкі Саюз заключыў з Латвіяй гандлёвы дагавор, які прынёс значныя вельмі значныя выгады і ў цяперашні перыяд, калі Латвія побач з рэштаю капіталістычнага свету ахоплена асабліва жорсткім крызісам. У 1926 г. СССР прадпісываў Латвіі, у ліку другіх Бальтыцкіх дзяржаў заключыць дагавор аб ненападзе, які павінен быў яшчэ ў большай ступені ўмацаваць узаемаадносіны паміж абедзьвюма краінамі. Перагаворы аб заключэньні гэтага дагавору, як вядома, не прывялі да спрыяючых результатаў, але не па віне Савецкага Саюзу.

Польшча, якая праводзіць палітыку гвалту і захвату, у выстарчальай ступені праявіла свае імпэрыялістычныя тэндэнцыі ў адносінах прыбальтыцкіх дзяржаў. Не гаворачы ўжо аб захвацe Вілешчыны і аб заветных мэтах пілсудчыкаў у адносінах вялікага ўсёй Літвы, і ў адносінах Латвіі, апэтыты польскіх імпэрыялістаў выявіліся ў выстарчальай меры. Польскі ўрад да гэтага часу ня лічыць урэгулюваным і так званае «пытаньне аб шасьці паветах», іншымі словамі Польшча прэтэндуе на пагранічны раён Латвіі. Калі такава афіцыяльная пазыцыя польскага ўраду, то ўчыньвы польскія колы, у асабліваасьці, памежніцкія ахвотна ўспамінаюць аб тым, што некалькі соцень гадоў назад значная частка Латвіі пад назвай «польскіх інфлянт» належыла польскім каралём.

Але польскія колы не абмяжоўваюцца бясспрэчнымі марамі. У капцы мінулага году латвійскія ўлады выкрылі, што цэлая сетка польскіх арганізацый у пагранічнай Латвійскай вобласьці-Латгаліі сыстэматычна вяла канспіраціўную работу, накіраваную да атарваньня Латгаліі ад Латвіі і на далучэньне гэтай вобласьці да Польшчы. Польскі ўрад ня толькі падтрымліваў гэту работу, але пасьлі репрэсій, прадпрынятых латвійскімі ўладамі ў адносінах замешаных у гэту справу арганізацый, **польскі ўрад адкрыта ўмешаўся і патрабаваў у Латвіі адмаўленьня ад прадпрынятых рэпрэсій.**

Усе гэтыя факты, добра вядомыя шырокім колам латвійскай грамадзкасьці, не могуць, зразумела, не адбіцца на польска - латвійскіх узаемаадносінах. Аднак, яны ня мелі істотных вынікаў. Гэты цікавы факт ускрывае вельмі многае ў польскай палітыцы ў Прыбальтыцы. Справа ў тым, што свае жаданьні і захопніцкія пляны ў адносінах прыбальтыцкіх дзяржаў, Польшча падпачальвае другім, больш для яе важным і істотным мэтам. Усім вядома, якое месца займае ў польскай палітыцы ідэя экспансіі на Ўсход, у бок Савецкай Украіны і Беларусі. Гэтай сваёй асноўнай вышэйшай палітычнай установцы пілсудчыкі падпачальваюць свае пляны ў адносінах прыбальтыцкіх дзяржаў, добра разумеючы, што ў выпадку посьпеху сваёй асноўнай задачы **ім ужо ня цяжка будзе рэалізаваць свае замыслы ў Прыбальтыцы.** Таму польская дыплёматыя ня толькі ўзмоцнена старацца затушаваць сапраўдныя намеры польскіх кіруючых колаў у адносінах Латвіі ў тых выпадках, калі гэтыя дамеры прарываюцца па верх, але наадварот, усялак разьвіваюць з сябе ролю прыяцеля і апякуна прыбальтыцкіх дзяржаў. Гэтыя дзяржавы, згодна польскіх замыслаў, павінны побач з Польшчай і Румыніяй скласьці адзіны блёк супроць Савецкага Саюзу.

Для прыцягненьня на свой бок кіруючых колаў прыбальтыцкай буржуазіі, польская дыплёматыя па-майстэрску старацца выкарыстаць так званую «чырвоную небясьпеку». Яна грае на жывотным страху кіруючых колаў Бальтыцкіх дзяржаў перад рэвалюцыяй, і выстаўляе Польшчу ў якасьці аплоту і абаронцы панаваньня латвійскай і эстонскай буржуазіі. Яна палохае кіруючыя колы гэтых дзяржаў зданьню «чырвонага імпэрыялізму» і даказвае, што толькі ў цесным саюзе з Польшчай прыбальтыцкія дзяржавы змогуць захаваць буржуазны лад.

Трэба сказаць, што калі польскай дыпэёматы і ня ўдалося дагэтуль дабіцца адкрытага далучэньня Латвіі і Эстоніі да польска-румынскага блёку, дык ва ўсякім выпадку яна пабыла значны ўплыў на палітыку гэтых дзяржаў. Няма чаго даказваць, што такое становішча зьяўляецца вельмі небясьпечным, як з пункту гледжаньня інтэрэсаў сьвету, так і інтэрэсаў самых прыбальтыцкіх дзяржаў. Гота лепш за ўсё выявілася ў цяперашніх перагаворах аб заключэньні дагавораў аб ненападзе паміж СССР і Прыбальтыцкімі дзяржавамі.

Імкненьне Прыбалтаў зьвязаць лёс гэтых дагавораў з заключэньнем з СССР падобных-жа актаў з другімі сваімі суседзямі, стварыла становішча, пры якім умацаваньне мірных адносін паміж Савецкім Саюзам і Прыбальтыцкімі дзяржавамі пастаўлена ў залежнасьць ад нязбыўных прэтэнзій румынскіх баяр, каб СССР прымірыўся з акупацыяй Бесарабіі. Зусім ясна, што правільна зразумелыя інтэрэсы прыбальтыцкіх дзяржаў патрабуюць, каб яны вялі больш самастойную і незалежную палітыку і ня служылі-б мэтам польска-румынскага імпэрыялізму.

Конст.

ПОЛЬСКІ ФАШЫЗМ РЫХТУЕЦЦА ДА ЗАХВАТУ ДАНЦЫГУ

БЭРЛІН. 13. У германскіх палітычных колах і ў друку надзвычай устрывожаны завоёўчымі плянамі Польшчы у адносінах **Данцыгу і Ўсходняй Прусіі.** Газэты падаюць сёньня вытрымкі з прамоў выступаўшых на сходзе польскіх студэнтаў у Данцыгу, якія патрабавалі канчатковага далучэньня Данцыгу да Польшчы. Згодна паведамленьня газэт, у пачатку сходу адбылося набажэньства, у часе якога польскі ксёндз заявіў, што «**на гэтай польскай зямлі хутка зьявяцца польскія войскі».**

Дарадца польскага пасольства ў Данцыгу — **Ланіцкі заявіў,** што польскія студэнты ў Данцыгу зьяўляюцца тымі-жа салдатамі, якія ў выпадку неабходнасьці будуць змагацца са зброяй у руках. Паводле слоў Ланіцкага ня толькі палякі Данцыгу, але і палякі Ўсходняй Прусіі злучацца са сваёй польскай бацькаўшчынай.

Старшыня дырэкцыі польскіх чыгунак у Данцыгу — Добжы заявіў, што польскія чыгункі дапамогуць правядзеньню мабілізацыі. Прадстаўнік Паморскага ваяводы — Зэйдліц заявіў, што некаторыя дзяржавы ня будуць пярэчыць польскаму выступленьню супроць Германіі, **асабліва Францыя,** якой Германія пагражае тым, што больш ня будзе плаціць рэпарацый.

Паводле слоў Зэйдліца, Францыя павінна ў інтэрэсах усяго сьвету энэргічна рэагаваць на паводзіны Германіі, а гэта можа быць ажыцьцёўлена толькі пасьля таго, як Францыя забясьпечыць сваю бясьпечнасьць, шляхам акупацыі германскіх пагранічных раёнаў. Пры гэтым Польшча павінна адыграць важную ролю, **заняўшы Ўсходнюю Прусію і Данцыг.**

Прадстаўнік вышэйшага ваеннага камандаваньня ў Торне, **палкоўнік Ландаў** заявіў, што ён хутчэй нападзе ў Кенігсбэрг у ваеннай форме, чым у другі раз ў Данцыг — у цывільнай. Паўкоўнік лічыць, што калі Ўсходняя Прусія парошце будзе акупавана, дык ніякая сіла ў сьвеце ня зможа выгнаць адтуль польскага салдата.

У канцы сходу былі пасланы прывітальныя тэлеграмы польскаму прэзыдэнту, Пілсудзкаму і начальніку польскага генэральнага штабу. (ТАСС.)

Менск, друкарня «Зьвязды».

Галоўлітбел № 337.

Паведамленьні

Дом Камасьветы. 16-2, у 8 гадз.— адбудзецца вечар для слухачоў партсеткі г. Менску. 1) Даклад аб марксыцка-ленінскім выхаваньні. 2) Чытка рапартоў і заключэньне сац. умоў на паляпшэньне партвучобы паміж зав. «Бальшавік» і «Кастрычнік». Білеты ў ГК КП(б)Б і па арганізацыях.

— 18 лютага, у 6 гадз. веч., у Доме Чырвонай Арміі (Энгельса) склікаецца гарадзкі зьлёт па шэфстве над вёскай і садружаства з Чырвонай арміяй аб падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі і задачы шэфскіх арганізацый і садружаства. Прадпрыемствы зьвыш 500 чал. выпускаюць 8-х прадстаўнікоў, а іншыя прадпрыемствы 1 ўстановы на 1 чал.

Менгарком КП(б)Б.

Папраўка

Ва ўчарашным нумары нашай газэты ў прывітальнай тэлеграме Беларускай Акадэміі Навук—другому Беларускаму тэатру, ПА ВІНЕ ДРУКАРНІ перабліталы подпісы. Трэба чытаць: ПРЭЗЫДЭНТ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК—П. ГОРЫН.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

„Чырвоная Зорка" Каса—ад 1 г. дня. | НОВЫ ГУКАВЫ ФІЛЬМ „ТОММІ"

„Пітэрбургскі" Пач. у 2 г. дня. | Гарольд Лёйд у занемным фільме ШПАРКАСЬЦЬ І НАЦІСК

„ПРАЛЕТАРЫ" | З КАМЭДЫІ Ў АДЗІН СЭАНС 1) ЛУІ Ў РАЮ ў 3-х частках. 2) ЧАРЛІ Ў ТЭАТРЫ ў 2-х част. 3) ЛАСО ў 2-х частках. Ад аўторка. 16 лютага

КІНО „СПАРТАК" | 2 праграмы ў адзін сэанс 2 1) ХАКАСІЯ ў 5 частках 2) БЭСТЭР КІТОН у карціне ТРЫ ЭПОХІ камэдыя ў 6 част. Пачатак сэансаў: 7 гадз., 9 гадз. і 10 гадз. 45 м. КАСА АДКРЫТА з 5 гадз.

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА на 1932 год.

„ГИХЛ" КНІГАГАНДЛЁВАЕ АБ'ЯДНАНЬНЕ „НАШИ ДОСТИЖЕНИЯ"

Штомесячная ілюстраваная часопісь.

ЗЬМЕСТ № 1 (СТУДЗЕНЬ)

Пятилетка в действии. Дас системы. Крижановский Г. М.—

Энергетика. — Силой единства. Пятилетка в три года. Вторая программа партии. Полтора миллиона киловатт.

Металл.— Топливо.— Домна и мартены. Уголь. Нефть.

Машиностроение.— Список побед. Советские машины полям.

Сырьевая база.— Хлопок. Технические культуры. Каучук.

Транспорт.— Железные дороги. Реконструкция арычала. На стапелях. СССР на автомобиле.

Сельское хозяйство— Величайшая реконструкция. Ведущая колонна.

Трудовые рекорды Культура и быт.— Жизнь хозяев страны. Кадры индустрии. Всеобщее обучение. Культурный под'ем народов. Газета. Книга.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА: на год—5 р., на 6 м.—2 руб. 50 к., на 3 м.—1 руб. 26 к. АСОБНЫ НУМАР—50 к.

Падпісна прымаецца ўсімі аддзяленьнямі, магазынамі, кіёскамі і ўпаўнаважанымі Кнігацэнтру, на пошце і лістаносцамі.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА з № 1.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ на 6-цімесячныя КУРСЫ ПЛЯНАВІКОЎ і старшых вучотна-апэрацыйных прадаўнікоў сыстэмы ДЗЯРЖБАНКУ ПРАЦЯГНУТ ДА 25-га ЛЮТАГА

Аб умовах прыёму на курсы магчыма даведацца ва ўсіх аддзяленьнях Дзяржбанку ў гарадох і раёнах праз якія патрэбна дасылаць усе дакумэанты.

МЕНГАРБЮРО „САЮЗДРУКУ" паведамляе ўсе прадпрыемствы і ўстановы г. Менску, што АПОШНІ ТЭРМІН прыёму падпіскі на сакавік НА ЦЭНТРАЛЬНЫЯ (Маскоўскія) выданьні— 20-га а на МЕНСКІЯ— 23-га лютага. Пасьля вышэйпаказаных тэрмінаў прыём падпіскі на сакавік будзе спынены.

ПРЫ МЕНСКІМ ХЭМІКА-ТЭХНАЛЁГІЧНЫМ ТЭХНІКУМЕ харча-брадзільных працэсаў з 1 САКАВІКА г. г.

АДКРЫВАЮЦЦА два аддзяленьні па ХЛЕБАПЯЧЭНЬНІ:

1) па тэхналёгіі хлебапячэньня на 30 чал. Скончыўшы атрымліваае назву тэхніка-тэхналёга;

2) па мэханізацыі хлебапячэньня на 30 чал. Скончыўшы атрымлівае назву тэхналёга-мэханіка.

Заявы прымаюцца з 10 па 28 лютага. Правілы прыёму і забесьпячэньня—індустрыяльных тэхнікумаў. Інтэрнатам студэнты не забясьпечваюцца. У заяве неабходна паказаць аддзяленьне, на якое падае заяву, і прыкласьці наступныя дакументы: ласьвёдчаную анкету, даведку аб узросьце, для мужчын—аб адносінах да вайсковай службы, аб стане здароўя, аб адукацыі, дзьве фота-карткі, паштовых марак на 30 кап.

Заявы прымаюцца штодзенна з 10 да 3 гадзін у канцылярыі тэхнікуму. Выходныя дні: 5, 14, 15, 29 і г. д.

Адрас: г. Менск, Падгорны зав. 7, хэміка-тэхналёгічны тэхнікум.

ДЫРЭКЦЫЯ.

16|II, у 7 гадз. веч., у клубе Ле Іна АДБУДЗЕЦЦА ГРАМАДЗКА-паказальны суд над шавіністам Шлейзінгарам.

17 лютага, ў 9 гадз. веч., у памяшк. плянава-эканамічнага інстытуту (Унівэрсытэцкі Гарадок, галоўны корпус, аўд. 317) —АДБУДЗЕЦЦА— ЛЕКЦЫЯ прафэсора плянава-эканамічнага інстытуту Л. М. Бурэса на тэму: „тэхнічнае нармаваньне на сучасным этапе".

Запрашаюцца работнікі ТНВ, заводаў, фабрык, аб'яднаньняў і рабочыя плянава-вытрацыйных брыгад заводаў

На падставе пастановы СНК і ЦК КП(б)Б аб камунальнай гаспадарцы, абвешчанай у газэце „Савецкая Беларусь" 12|X—1931 году.

Вадаканалтрэст у 1932 годзе прыступае да каналізаваньня дамаўладаньняў гор. Менску па ўзгадненьні з Менкамгасам і сакадзорам у наступнай чарговасьці.

У ПЕРШУЮ ЧАРГУ:

Вуліца Валадарскага—№№ 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10, 11, 14, 15, 17, 18, 20|7, 21, 30.
„ Карла Маркса—№№ 2|17, 3, 4, 5, 9|23, 10, 11|8, 12, 15, 17, 19, 21, 23, 26, 27, 29, 31 34, 39, 47|30, 46, 56. СНК.
„ Унівэрсытэцкая—№№ 1|21, 2|23, 4, 16, 29, 31.
„ Лекерта 2-ая —лазьня.
„ Лекерта 2-ая —заводы: „Чырвоная Зорка", імя Варашылава, камардыў.
„ Савецкая —№№ 81, 85|24, 89, 91, 97|8, 92|26, 45, 59, 61, 73, 70, 31, 33.
„ Ленінская —№№ 3, 5, 6, 8, 9|2, 10, 13, 14, 15, 20, 22, 24, 25, 27, 29, 30, 31, 32 38|36, 40, 42, 44, 46|33.
„ Камуністычная—№№ 4, 6, 8, 10, 12, 14|12, 16|11, 5, 7, 9, 11.
„ Урыцкага —№№ 3, 4, 7, 8, 9.
„ Інтэрнацыянальная —№№ 3, 4, 6, 7, 12|20, 13, 14, 15, 17, 18, 19, 20, 22, 23, 26|1, 27, 28 30, 32, 33, 34, 36.
„ Энгельса —№№ 1|2, 4, 6, 8, 7, 9, 11, 12, 13, 15, 16, 17, 18, 20, 22, 23|44, 25 26|92, 28, 29|36, 30|47, 31, 33.
„ Масюўская —112 кватэрны дом.
„ Ульянаўская —вакзал.
„ Якольная —сталоўка.

У ДРУГУЮ ЧАРГУ:

Вуліца Камуністычная—№№ 18, 20, 26, 28, 30, 38, 42, 46, 13, 17, 19, 21, 23, 25, 29|7, 33 29.
„ Рэвалюцыйная—№№ 2|23, 4, 6, 8, 10, 12, 14|9, 16, 18, 20, 22, 24, 26, 28, 30, 32|8, 1, 5, 7, 11, 11-а, 13, 15, 17, 19, 21, 23, 25|6.
„ Свярдлоўская—№№ 1, 2, 3, 4, 7, 8, 10|2, 9, 11, 12|1, 15|1.
„ Камсамольская—№№ 1|13, 2|15, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9|14, 10|16, 11|7, 14, 15, 16, 18 20|12, 21, 22|13, 23, 24, 25, 26, 28, 29, 30, 32, 33, 37, 39, 40 42, 44|31.
„ Пляц Волі —№№ 3, 5, 7, 11|2, 13, 15, 17, 27|2, 29, 2, 8, 10, 14.
„ Нямігская —№№ 1, 2, 3, 5, 6, 7,